Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 МАЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №97 (28461)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Як арганізаваць стылізаванае вяселле**



**Моднае адзенне для людзей з асаблівасцямі**



**Сакрэты выхавання ад маці трайнят**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**776,7 рубля**

*склала налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў красавіку 2017 года (у сакавіку — 770,6 руб.), паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце краіны. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у красавіку дасягнула 777 руб. (у сакавіку яна была роўная 771,1 руб.).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8527 | ▲ |
| Еўра | 2,0715 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0705 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Квяцісты карагод



Фота БЕЛТА.

■ Класная навіны

## МАТЭМАТЫКА АДВАЁЎВАЕ СТРАЧАНЫЯ ПАЗІЦЫІ

**У наступным навучальным годзе ў сямікласнікаў беларускіх школ зменшыцца колькасць гадзін на вывучэнне хіміі, затое павялічыцца колькасць гадзін на вывучэнне матэматыкі. Пра гэта расказала на сустрэчы з журналістамі начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.**

— Хімія будзе выкладацца ў сёмым класе ў аб'ёме адной гадзіны на тыдзень, — растлумачыла спецыяліст. — Спецыялісты міністэрства вывучалі сітуацыю з гэтым прадметам у Расіі і Казахстане. Там таксама на яго адводзіцца ў сёмым класе толькі адна гадзіна, і гэта хутчэй падрыхтоўчы, уводны курс у хімію. У савецкай школе, нагадаю, хімія вывучалася на працягу чатырох апошніх гадоў, а мы цяпер адводзім на яе вывучэнне пяць гадоў. У восьмым і дзявятым класе хімія ў школьным раскладзе будзе займаць ужо дзве гадзіны на тыдзень. А вось на матэматыку сямікласнікам цяпер будзе выдзяляцца пяць гадзін на тыдзень замест чатырох. Калі ў пятых і шостых класах школ і гімназій раней прадугледжвалася аднолькавая колькасць гадзін на матэматыку, то пачынаючы з сёмага класа гімназісты мелі пэўную перавагу перад школьнікамі ў аб'ёме адной лішняй гадзіны. Цяпер такая няроўнасць будзе ліквідаваная. Але гэта не азначае, што павялічыцца аб'ём тэорыі па матэматыцы, проста ў настаўніка і вучняў будзе больш часу, каб адпрацаваць і замацаваць атрыманыя веды на практыцы.

Святлана Уклейка нагадала, што пачынаючы з 2015/2016 навучальнага года распачаўся паэтапны пераход на адносную завершанасць адукацыі на II ступені школы. На працягу бягучага навучальнага года абноўленыя вучэбныя праграмы дзейнічалі ўжо ў першых, другіх, пятых, шостых, дзясятых і адзінаццатых класах. Але, як сведчыць практыка, апрабацыя новых праграм патрабуе ўнясення пэўных карэктыў, таму з 1 верасня вучэбныя праграмы будуць адкарэктаваныя ва ўсіх класах і па ўсіх дысцыплінах.

СТАР. 3

■ Год навукі

## ЖЫВЫ БАНК ПРЫРОДЫ

### У Цэнтральным батанічным садзе з'явіцца новы сімвал беларускай сталіцы



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Уладзімір ЦІТОК: «У дзяржаўны рэестр унесены пяць айчынных сартоў прадстаўнікоў рода Citrus, якія вылучаюцца высокай ураджайнасцю і ўстойлівасцю пры вырошчванні ў закрытым грунце ва ўмовах Беларусі».

**Больш як 5,2 тысячы відаў і 14 тысяч узораў жывых раслін змяшчаюцца ў калекцыях Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай акадэміі навук (ЦБС). А ў гербарыях сасудзістых раслін і лішайнікаў захоўваюцца каля 30 тысяч гербарных лістоў. Па гэтых паказчыках Цэнтральны батанічны сад уваходзіць у кола найбуйнейшых батанічных садоў краін СНД і супастаўны з вядучымі батанічнымі садамі краін сярэднееўрапейскага рэгіёна. Напярэдадні 85-гадовага юбілею ЦБС яго кіраўніцтва арганізавала для журналістаў прэс-тур, каб расказаць пра дасягненні навуковай установы і планы на будучыню.**

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

## Пацвярджэнне зацікаўленасці



**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА прыбыў у Кіта, сталіцу Эквадора, для ўдзелу ва ўрачыстай цырымоніі інаўгурацыі абранага Прэзідэнта гэтай краіны Леніна Марэна.**

Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, у аэрапорце Кіта Уладзіміра Андрэйчанку сустракаў намеснік старшыні Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Эквадор Карлас Бергман. Ён праінфармаваў нашага спікера пра пачатак працы парламента Эквадора новага склікання. Бакі пацвердзілі зацікаўленасць у далейшым нарошчванні беларуска-эквадорскіх міжпарламенцкіх сувязяў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

## Бесперапынная сувязь

**Аблвыканкамы і Мінгарвыканкам 27 мая ў суботу правядуць чарговыя прамыя тэлефонныя лініі. З 9.00 да 12.00 на званкі жыхароў краіны будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам** — намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам** — старшыня ШАРСТНЁЎ Мікалай Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам** — старшыня абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам** — кіраўнік справамі ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам** — намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам** — намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам** — намеснік старшыні КРЭПАК Аляксандр Пятровіч (80172224444).

■ Ва ўрадзе

# ПАДЫМАЕМ РЭГІЁН

**Падчас выязнога пасяджэння Прэзідыум Савета Міністраў абмеркаваў комплексны план першачарговых мер па развіцці Аршанскага раёна. Прыцягненне інвестыцый, уцягненне ў абарот маёмасці, якая неэфектыўна выкарыстоўваецца, і новыя рабочыя месцы — вось тыя пытанні, якія падымаліся падчас наведвання прадпрыемстваў.**

### Напрамкі развіцця

На пасяджэнні **прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ** падкрэсліў, што асноўнае для раёна — гэта рост аб'ёмаў і эфектыўнасці вытворчасці тавараў і паслуг. Гэта дае дадатковыя падатковыя паступленні, магчымасці для развіцця інжынерна-транспартнай інфраструктуры. Трэба працаваць і над тым, каб у максімальнай ступені загрузіць прадпрыемствы. Але, акрамя эканамічных мер, ёсць і больш простыя, але таксама працаёмкія спосабы развіцця рэгіёна: навядзенне парадку на зямлі, правядзенне спартыўных і культурна-забаўляльных мерапрыемстваў. Яны могуць забяспечыць больш прыток турыстаў і задзейнічаць інфраструктуру, якая створана ў рэгіёне. Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на тое, што праграма развіцця Аршанскага раёна павінна змяшчаць планы на кароткі і сярэдні тэрмін, каб аператыўна вырашыць праблемы і бачыць далейшае развіццё.

Пра магчымасць выкарыстання Оршы як вытворча-зборачнага цэнтра з паступовым павелічэннем ступені лакалізацыі прадукцыі расказаў **міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ.** Ён прапанаваў прапрацаваць гэта пытанне. Да таго ж яно ўвязваецца з развіццём вытворча-лагістычнай пляцоўкі ў Балбасаве. Неабходна больш актыўна развіваць і транспартны патэнцыял. У будучым гэта дасць эфект пры павелічэнні паставак з замежжа і пры спалучэнні ЕАЭС і эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ** звярнуў увагу на тое, што ў Аршанскім раёне існуе праблема недахопу высокакваліфікаваных спецыялістаў. Да таго ж практычна 60% тых, хто працуе, — гэта людзі, старэйшыя за 40 гадоў. А кадравы рэзерв — адна з умоў добрага развіцця.

### На вытворчасці

Філіял «Салодкая краіна» кандытарскай фабрыкі «Віцьба» задумваўся як імпартазамяшчальнае прадпрыемства. Але пакуль яго прадукцыя займае толькі каля 10% долі рынку. **Дырэктар фабрыкі Хачатур АРЗУМАНАЎ** расказвае: каб выйсці на поўную магутнасць, трэба займаць 30% палічнай прасторы. «Мы можам выпрацоўваць пры двухзменным рэжыме работы парадку 2400 тон прадукцыі». Нягледзячы на прымальную цану, высокая канкурэнцыя ў гэтым сегменце пакуль не дазваляе выраблюць названы аб'ём. Андрэй Кабякоў звярнуў увагу на тое, што неабходна займацца рэкламай прадукцыі, каб яна была пазнавальнай.

На Аршанскім авіярамонтным заводзе разглядалі асваенне інвестыцый, а таксама перспектывы стварэння прамыслова-лагістычнага цэнтра. Першая чарга будаўніцтва павінна завяршыцца ў 2018 годзе. Калі стварыць аб'екты выйдуць на поўную магутнасць, а гэта плануецца зрабіць да 2021 года, грузапаток складзе 1,8 млн тон грузаў на год, чысты прыбытак — 7 млн рублёў. Гэта азначае, што праект акупіцца за пяць гадоў. Значным стымулам для развіцця цэнтра стане наданне міжнароднага статусу ўзлётна-пасадачнай палосе аэрадрома. Андрэй Кабякоў пагадзіўся ў хуткім часе разгледзець гэта пытанне. Статус дасць магчымасць прымаць замежныя грузавыя самалёты днём пры добрай бачнасці. Для далейшага развіцця ў гэтым кірунку спатрэбіцца каля 17 млн рублёў інвестыцый на тое, каб пераасначасціць паласу.

### Мясцовая ўлада

**Старшыня Балбасаўскага пасялковага выканкама Глеб ГУЛЯНКОЎ** адзначыў, што сёння каля паловы эканамічна занятага насельніцтва пасёлка працуюць на Аршанскім авіярамонтным заводзе. Пры гэтым беспрацоўе складае толькі 0,5%. За апошнія гады ў Аршанскім раёне з'явіліся прадпрыемствы з італьянскім, англійскім, дацкім капіталам. **Першы намеснік старшыні райвыканкама Сяргей ПАЦ** таксама лічыць, што неабходна развіваць малы і сярэдні бізнес, а таксама мадэрнізаваць прадпрыемствы рэспубліканскай формы ўласнасці. «Прыватны бізнес больш гнутка рэагуе на тыя змены, якія адбываюцца ў нас у цэлым у эканоміцы і пры пастаўках на экспарт».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Тэрэза Мэй: наступны тэракт у Брытаніі, магчыма, ужо нельга прадухіліць



Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі абвясціла аб павышэнні ўзроўню тэрарыстычнай пагрозы ў краіне з «сур'ёзнага» да максімальнага «крытычнага», што азначае непасрэдную пагрозу тэракта.

Узровень тэрарыстычнай пагрозы ўстанаўліваецца Аб'яднаным цэнтрам аналізу тэрарызму, куды ўваходзяць эксперты са складу паліцыі, разведслужбаў і іншых сілавых структур.

«Паводле іх ацэнкі, імавернасць нападу не проста застаецца высокай, але наступны напад можа быць непазбежным», — заявіла брытанскі прэм'ер. Па словах Мэй, нельга выключыць магчымасць таго, што ў краіне ёсць цэлая група людзей, якія маюць дачыненне да тэракта ў Манчэстэры.

Міністр унутраных спраў Эмбер Рад паведаміла, што патруляваць вуліцы брытанскіх гарадоў будуць нароўні з паліцыяй 3800 ваеннаслужачых брытанскай арміі. Дадаткова будуць ахоўвацца ўсе ключавыя аб'екты інфраструктуры і турыстычныя славутасці па ўсёй краіне.

Тым часам з-за павышанага ўзроўню тэрарыстычнай пагрозы ўчора быў адменены традыцыйны развод варты каля Букінгемскага двара, лонданскай рэзідэнцыі каралевы Лізаветы II.

### У Радзе запатрабавалі прызнаць незаконным блакіраванне расійскіх сацсетак

«Фракцыя «Апазіцыйнага блока» і шэраг пазафракцыйных дэпутатаў Вярхоўнай рады звярнуліся ў Канстытуцыйны суд з просьбай прызнаць незаконным блакіраванне доступу да расійскіх інтэрнэт-рэсурсаў і сацсетак ва Украіне.

Шаснаццатага сакавіка ўкраінскі прэзідэнт Пётр Парашэнка зацвердзіў пашыраны спіс расійскіх грамадзян і кампаній, у дачыненні да якіх уводзяцца санкцыі. Сярод іншага пад забаронай апынуліся шэраг расійскіх СМІ, а таксама сацыяльныя сеткі «ВКонтакте», «Одноклассники» і рэсурсы «Яндекс» і Mail.ru. Усяго ў пералік увайшлі 1228 фізічных і 468 юрыдычных асоб.

Рашэнне Парашэнкі выклікала незадаволенасць і сярод радавых украінцаў. Так, на сайце прэзідэнта размешчана некалькі дзясяткаў петыцый з просьбай адмяніць блакіраванне расійскіх сайтаў.

### Большасць амерыканцаў упэўнены, што ЗША перажывае маральны заняпад

Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага сацыялагічнай службай Gallup.

Як паказала даследаванне, 81% жыхароў Злучаных Штатаў лічаць сітуацыю з маральнымі каштоўнасцямі ў краіне «пасрэднай» ці «дрэннай», а 77% мяркуюць, што яна «пагаршаецца». Служба Gallup праводзіць такія апытанні з 2002 года і адзначае, што, на думку амерыканцаў, сітуацыя з маральнымі каштоўнасцямі ў краіне становіцца горшай ужо сёмы год запар.

■ Прамысловасць

# ТЭМП РОСТУ ЗАХАВАЕЦЦА ДА КАНЦА ГОДА?

**У сталіцы адкрыўся «Беларускі прамысловы форум — 2017». Сёлета на яго пляцоўцы сустрэнуцца каля 300 беларускіх і замежных кампаній. Як адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА, мерапрыемства ўжо стала традыцыйным для дыскусій вытворцаў, навуковых дзеячаў і многіх іншых зацікаўленых асоб у развіцці прамысловага комплексу.**

Ён нагадаў, што Беларусь па праву называлася зборачным цэхам СССР. «Сёння мы не толькі захавалі машынабудаўнічы прамысловы патэнцыял, але і прымножылі яго. Варта таксама адзначыць, што станоўча на развіццё сферы ўплывае і дыверсіфікацыя экспарту машынабудавання. Калі не так даўно да 75% гэтай прадукцыі пастаўлялася ў Расію, то сёння каля 50% ужо экспартуецца ў іншыя краіны. За апошнія 8 гадоў у сферы сельскага машынабудавання было створана прадукцыі на 23,4 млрд долараў. Прычым на пераабсталяванне айчыннай сельгасвытворчасці выдаткавалі толькі 6,8 млрд долараў. Астатняе было экспартавана ў іншыя краіны», — растлумачыў намеснік прэм'ер-міністра.

Акрамя таго, паводле яго слоў, у айчыннай машынабудаўнічай галіне сёння заказаў больш, чым магчыма вырабіць. «Гэта агульная праблема для нашых гігантаў. Было б больш абаротнага капіталу, мы б значна эфектыўней загрузілі вытворчасць», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка. Разам з тым ён выказаў надзею, што да канца года захаваецца існуючы тэмп росту прамысловай вытворчасці, які за два месяцы дайшоў да адзнакі 103,1%, за тры месяцы — 104,3%, за чатыры — 105,4%.

Кажучы пра пункты росту, віцэ-прэм'ер нагадаў, што адноўлены аб'ёмы паставак расійскай нафты. «У другім паўгоддзі будзе значна больш эфектыўна працаваць «Белнафтахім» у адносінах да мінулага года, калі адбылося рэзкае зніжэнне паставак нафты. Сёлета мы толькі пачалі нарошчваць аб'ёмы. Другое паўгоддзе і па аб'ёме, і па экспарце шмат у чым будзе вызначальным», — растлумачыў Уладзімір Сямашка.

Таксама ён расказаў, што не пазней за канец чэрвеня ў краіне павінны ўвесці ў строй і правесці кантрольныя выпрабаванні першай прамысловай партыі легкавых аўтамабіляў, якія будуюцца на заводзе «БелДжы». Уладзімір Сямашка адзначыў, што будаўніча-мантажныя работы на заводзе выкананы на 99,3%. Тэхналагічнае абсталяванне для асноўных і дапаможных вытворчасцяў пастаўлена на пляцоўку, змантавана і практычна адладжана. Тры базавыя цэхі: зваркі, афарбоўкі і канчатковай зборкі, выпрабавання, паводле ацэнак спецыялістаў, будуць гатовыя да правядзення тэстаў ужо 15 чэрвеня. Далей за трое сутак бесперапыннай работы павінна быць сабрана 222 аўтамабілі. Тэсціраванне дазволіць праверыць работу ўсіх цэхаў, якасць зборкі па ўсіх параметрах. «Да канца года мы павінны мець прадпрыемства магутнасцю 60 тысяч аўтамабіляў на год. Калі продажы пойдуць добра, на заводзе закладзены патэнцыял на выпуск 120 тысяч аўтамабіляў штогод», — дадаў віцэ-прэм'ер. У перспектыве плануецца забяспечыць узровень лакалізацыі вытворчасці не меншы за 50%.

* * *

Між тым беларуская прамысловасць усё яшчэ сур'ёзна зацікаўленая ў фінансаванні. Шэраг прадпрыемстваў сёння паспяхова асвойваюць інвестыцыйныя праекты. Так, па словах Уладзіміра Сямашкі, на прадпрыемстве БелАЗ пяты год рэалізуецца праграма, куды ўкладзена каля 800 млн долараў. «Дзякуючы гэтаму мы цалкам закрылі патрэбы сусветных спажыўцоў у нашай наменклатуры. Прычым доля БелАЗа на глабальным рынку расце і ўжо складае каля 30%. Яшчэ 5—6 гадоў таму яна складала толькі 17—18%. Мы стварылі ўсю лінейку тэхнікі грузападымальнасцю ад 25 да 450 тон. Многія з гэтых машын ніхто акрамя нас у свеце не выпускае. Мы ўжо зрабілі першыя машыны-беспілотнікі, якія кіруюцца праз сістэму глабальнага пазіцыянавання», — расказаў Уладзімір Сямашка.

Кажучы пра іншае вядомае беларускае прадпрыемства — МАЗ — намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што яно цяпер перажывае не самы лепшы перыяд. Па яго словах, на аўтамабільным заводзе ёсць праблемы, якія датычацца аб'ёмаў выпушчанай тэхнікі. Каля трох гадоў таму на прадпрыемстве выраблялася каля 24 тысяч аўтамабіляў на год. Сёлета гэта лічба склалася на ўзроўні 6,7 тысяч адзінак тэхнікі. Пры гэтым захоўваецца імавернасць, што прадпрыемства не выйдзе на ўзровень 11 тысяч адзінак па выніках года. «У развіццё МАЗа неабходна больш інвеставаць, каб вырабіць новую кабіну, новыя масты, восі. Ужо зараз ёсць інвестыцыйныя праграмы, і цяпер мы вырашаем праблемы з крыніцамі фінансавання, каб развіваць прадпрыемства», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка. Гаворка ідзе аб сродках у памеры каля паўмільярда долараў.

Ужо цяпер у краіне плануюць пабудаваць новы завод па вытворчасці аўтатрактарнай тэхнікі. На думку віцэ-прэм'ера, гэта паспрые развіццю канкурэнтнага асяроддзя, у тым ліку і для МТЗ. На рэалізацыю праекта спатрэбіцца каля 300—350 млн долараў. Гаворачы аб фінансаванні праекта, Уладзімір Сямашка адзначыў, што гэта будуць крэдыты замежных банкаў, прычым асноўная лінія — кітайскія крэдыты. Завод плануецца пабудаваць за тры гады пасля прыняцця канчатковага рашэння па крэдытаванні.

Намеснік прэм'ер-міністра закрануў і тэму забеспячэння машынабудавання ўласным металам. «З пускам паза летась драбнасортнага драцянога стана на БМЗ мы на 60% закрылі патрэбу галіны, — падкрэсліў Уладзімір Сямашка. — Гэта абсалютна канкурэнтаздольнае прадпрыемства і адна з асноўных пазіцый, з якой мы выходзім на міжнародны рынак. Але на гэтым спыняцца нельга — перад БМЗ стаіць задача забяспечыць на 100% патрэбы машынабудавання ў метале. Задача няпростая, а кошт пытання складзе 800—850 млн долараў».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zvizda.by*

■

■ Падзея

# ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ СКАРБНІЦА КРАІНЫ

## Штогод Нацыянальны архіў Беларусі наведвае звыш дзвюх тысяч чалавек

**Напярэдадні свайго 90-годдзя адзін з вядучых архіваў Беларусі сабраў за круглым сталом у Акадэміі навук гісторыкаў, архівістаў і экспертаў. Акрамя абмеркавання надзённых пытанняў і перспектыў у развіцці архіўнай справы, было прэзэнтавана гісторыка-дакументальнае выданне, якое расказвае пра асноўныя гістарычныя вехі ўстановы.**

У тым ліку — пра лёс архіва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З-за імклівага наступлення ворага Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі, як ён тады называўся, не паспелі эвакуіраваць. Частка дакументаў беззваротна знікла. Ужо пасля вайны ўсяго толькі 30 тысяч спраў адшукалі ў Магілёве, каля 50 тысяч спраў знаходзілася ў Рызе — немцам так і не ўдалося вывезці іх у Германію. Збор дакументаў пачыналі амаль з нуля.

Сёння гэта найбуйнейшае сховішча дакументаў па гісторыі Беларусі ХХ стагоддзя, першая з якіх датуюцца 1917 годам. Нацыянальны архіў захоўвае звыш 1,1 мільёна спраў, якія займаюць амаль 40 тысяч метраў стэлажных паліц — менавіта такая адлегласць ад Мінска да Сілічаў.

— У апошні час значна ўзрасла цікавасць грамадзян да архіваў, — адзначыў **дырэктар дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Віктар КУРАШ.** — І гэта датычыцца не толькі даследчыкаў. Усё больш і больш людзей шукае свае карані, хоча ведаць усё пра сваё паходжанне.

Штогод Нацыянальны архіў наведвае больш за дзве тысячы чалавек. Магчыма, гэта звязана і з тым, што спрасціўся доступ да дакументальных крыніц. **Кандыдат гістарычных навук Уладзімір АДАМУШКА,** які шмат гадоў узначальваў дэпартамент па архівах і справаводстве, стаяў каля вытокаў укаранення ў архіўную справу сучасных тэхналогій. «У першую чаргу ў «лічбу» пераводзяцца асабліва каштоўныя і ўнікальныя дакументы, а таксама страхавы фонд, — расказвае гісторык. — Акрамя таго, гэта датычыцца навукова-даведачнага апарату: цяпер карыстальнік можа націснуць адпаведную кнопку і паглядзець, дзе і што знаходзіцца. У такім выпадку чалавек менш заказвае спраў: архівы, як і людзі, не любяць стрэсу. Але ў гэтай сітуацыі не трэба гнацца за колькасцю. Мала перавесці дакумент у лічбавы фармат, трэба зрабіць для яго навукова-даведачны апарат, прызначыць яму адпаведнае месца, вызначыць выкарыстанне. У той жа час перавод дакументаў у лічбавы фармат — не панацэя: яшчэ ніхто ў свеце не вызначыў, колькі часу захоўваецца лічбавая копія».

Сёння Нацыянальны архіў уяўляе сабой не толькі адно з найбуйнейшых сховішчаў дакументальнай інфармацыі нашай краіны, а і з'яўляецца значным грамадска-культурным цэнтрам. Папулярызацыя дакументальнай спадчыны — адна з асноўных яго задач. Пачынаючы з 2007 года супрацоўнікамі архіва падрыхтавана 95 выставак, за гады існавання выдадзена 171 кніга: зборнікі дакументаў і даведнікі.

— Дзякуючы супрацоўніцтву вучоных і архівістаў фактычна створана фундаментальная аснова для далейшага развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі, — перакананы **акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук, член-карэспандэнт Аляксандр КАВАЛЕНЯ.** — Без гэтай фундаментальнай асновы казаць аб ідэалагічнай рабоце, развіцці культуры, мовы і літаратуры немагчыма.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Харавство

# КАРАЛЕВЫ ВЯСНЫ

## Самую грацыёзную і артыстычную студэнтку выбралі ў Мінску




**У сталіцы чарговы раз прайшоў нацыянальны фінал міжнароднага міжуніверсітэцкага конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева Вясна — 2017». За галоўны тытул у творчых і інтэлектуальных спаборніцтвах змагаліся пятнаццаць прадстаўніц ВНУ з розных рэгіёнаў краіны. Дзяўчаты дэманстравалі гледачам і журы сваю сцэнічную культуру, уменне камунікаваць з аўдыторыяй, веданне этыкету, пачуццё гумару, грацыю, інтэлектуальныя і творчыя здольнасці, артыстычнае майстэрства і, вядома, знешнія даныя.**

Нацыянальны фінал уяўляў з сябе тэатралізаванае прадстаўленне, асноўнай тэмай якога быў Год навукі. Па задуме арганізатараў, маладыя вучоныя і адначасова вядучыя шоу знаходзіліся ў пошуку формулы прыгажосці, а конкурсанткі дапамагалі ім у эксперыментах. Так, у інтэлектуальным конкурсе ў фармаце бліц-інтэрв'ю кожная з дзяўчат павінна была расказаць, якімі яна бачыць навуковыя дасягненні Беларусі ў 3017 годзе. Да тэмы навукі былі прывязаны і дэфіле — у адным з іх кожная ўдзельніца прымерала на сябе адзенне са спецыяльнай «касмічнай» калекцыі. А ўсяго юныя прыгажуні дэфілíравалі па сцэне ажно пяць разоў!

У выніку галоўныя прызы конкурсу адправіліся ў рэгіёны. Абсалютным пераможцам і ўладальніцай тытулу «Каралева Вясна Беларусі — 2017» стала студэнтка чацвёртага курса Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Сняжана Міхейцава *(на здымку)*. Званне «Першай віцэ-Каралевы Вясны» заваявала першакурсніца Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Алёна Янко. Менавіта гэтыя дзве дзяўчыны прадстаўяць нашу краіну ў фінале міжнароднага конкурсу, які сёлета пройдзе ў Расіі. Трэцяе месяца і тытул «Другая віцэ-Каралева Вясна» дасталіся прадстаўніцы Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Хрысціне Нікіфаравай.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# САЖАЛКА... У ПАДВАЛЕ

**Жыхар вёскі Пырашава на Лашанскім вадасховішчы на Уздзенскім раёне вылавіў дзвюма сеткамі каля 15 кілаграмаў рыбы. Затрымлівалі парушальніка, які ўжо паспеў знікнуць з вадаёма, у яго дома.**

Мокрыя сеткі сушыліся ў двары, на агароджы ўсёй рыбацкі касцюм. А вось сама рыба плавала ў... падвале. Справа ў тым, што з-за павышэння ўзроўню грунтовых вод там утварыўся мінівадаём, які гаспадар вырашыў ператварыць у жылую сажалку. Праўда, рыба ў ёй ужо была нежывой. Як паведамілі ў дзяржінспекцыі, браканьера прыцягнуць да крымінальнай адказнасці, апроч таго, ён мусіць выплаціць 2,7 тысячы рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот №1** | | | |
| **Магазин №25** | 54,4 кв. м | 600/ С-139863 | Минская обл., Минский р-н, Хатежинский с/с, д. Дубенцы, ул. Центральная, 11А |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0484 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №25 (срок действия по 10.07.2037) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 20 000 руб. 00 коп.** | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Здание магазина №36** | 150 кв. м | 600/ С-155271 | Минская обл., Минский р-н, Шершунский с/с, д. Рогово, ул. Гастелло, 4А |
| Составные части и принадлежности: пристройка, хоз. блок | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0771 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №36 (срок действия по 29.09.2043) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка») | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 50 000 руб. 00 коп.** | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **Магазин №37** | 37,5 кв. м | 600/ С-139783 | Минская обл., Минский р-н, Роговский с/с, д. Чировичи, 17А |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0158 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №36 (срок действия по 18.09.2042) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка») | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 4 000 руб. 00 коп.** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| **Аукцион состоится 27.06.2017** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 26.06.2017** до 17.00 по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029 317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by** | | | |


# МАТЭМАТЫКА АДВАЁЎВАЕ СТРАЧАНЫЯ ПАЗІЦЫІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Усе вучэбныя праграмы пераглядаюцца і аналізуюцца на прадмет захавання міжпрадметных сувязяў і іх практыкаарыентаванасці. Скажам, вучэбныя праграмы па фізіцы аналізуюцца спецыялістамі па матэматыцы і хіміі, па хіміі — адпаведна матэматыкамі і фізікамі і гэтак далей.

Змяненні ў школьнай праграме закранулі і фізіку: яе вывучэнне цяпер распачынаецца на год пазней — з 7 класа, але агульная колькасць вучэбных гадзін, адведзеных на вывучэнне фізікі на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, засталася нязменнай, паколькі **ў 9-м класе будуць ужо не два (як цяпер), а тры ўрокі фізікі на тыдзень.**

Цяпер ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі выкарыстоўваецца 259 найменняў падручнікаў. Летась было выдадзена 8 прынцыпова новых падручнікаў, у гэтым годзе плануецца выдаць 41. Большая іх частка падрыхтаваная для пачатковых і сярэдніх класаў. Толькі ў сёмым класе з'явіцца 12 падручнікаў новага пакалення, напрыклад па алгебры, геаметрыі, фізіцы, мовах, гісторыі, геаграфіі... Паступаць ва ўстановы адукацыі яны пачнуць ужо з ліпеня. Інфармацыя ў абноўленых падручніках будзе выкладацца больш даступнай моваю. Што датычыцца такіх дысцыплін, як алгебра або геаметрыя, то ў падручніках з'явяцца задачы розных узроўняў — як базавага, так і алімпіяднага, напрыклад задачы даследчага характару.

Да выпускных экзаменаў за курс сярэдняй школы застаюцца лічаныя дні. Сёння ўсе выпускнікі на выхадзе з сярэдняй школы здаюць чатыры абавязковыя экзамены: па адной з дзяржаўных моў (беларускай ці рускай), матэматыцы, замежнай мове і гісторыі Беларусі. Такім чынам, матэматыку здаюць усе — і «фізікі», і «лірыкі»... Але ўжо ў гэтым годзе адбудзецца першы масавы выпуск з профільных класаў. А на старшай профільнай ступені вывучаюць на павышаным узроўні і фізіка, і хімія, і біялогія, і іншыя дысцыпліны. Таму ўзнікае заканамернае пытанне: чаму выпускнікі не здаюць іспыты па сваім профілі?

> **«Апасенні, што большасць дзесяцікласнікаў будуць выбіраць на старшай ступені школы гуманітарны профіль, на шчасце, не спраўдзіліся».**

Адказваючы на пытанне журналіста «Звязды», Святлана Уклейка канстатавала, што пакуль гэта тэма застаецца адкрытай: «У нас у хуткім часе запланаваны рабочыя сустрэчы на ўзроўні кіраўнікоў і спецыялістаў аддзелаў і ўпраўленняў адукацыі. У чэрвені і ліпені мы плануем працягнуць абмеркаванне падчас нашых выездаў ва ўстановы адукацыі. Трэба знайсці разумны баланс, бо пакуль незразумела, што рабіць з агульнай колькасцю экзаменаў, улічваючы даволі сціслыя тэрміны выпускной экзаменацыйнай кампаніі, якой на пятікі наступае ЦТ. Да таго ж паміж выпускнымі іспытамі абавязкова павінен быць прадугледжаны дзень для адпачынку. Выпускныя вечары Міністэрства адукацыі рэкамендавала ў гэтым годзе правесці 9 ці 10 чэрвеня з той жа мэтай — каб у абітурыентаў, якія будуць здаваць на ЦТ беларускую мову, заставаўся хоць бы адзін дзень для адпачынку. Будзем думаць, але ў любым выпадку рашэнне будзе агучана да 1 верасня, каб выпускнікі 2018 года загадзя ведалі «правілы гульні».

Святлана Уклейка прызналася, што ўсе з нецярплівасцю чакаюць вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання, каб прааналізаваць, як справіліся з тэстамі па «сваіх прадметах» выпускнікі профільных класаў. Дарэчы, апасенні, што большасць дзесяцікласнікаў будуць выбіраць на старшай ступені школы гуманітарны профіль, на шчасце, не спраўдзіліся. Пакуль што сярод прадметаў, якія вывучаюцца старшакласнікамі на павышаным узроўні, лідзіруюць фізіка і матэматыка.

Наконт графіка працы школ з 1 верасня спецыяліст паведаміла, што трэцяя частка ўстаноў адукацыі ўжо працуе з 9 гадзін раніцы. Яшчэ трэціна — з 8.30. Гэта значыць, што з 8 раніцы працуе толькі трэцяя частка школ.

Між іншым, як паказала апытанне бацькоў, праведзенае ў рамках штогадовага маніторынгу, у якасці галоўнай прычыны стомленасці сваіх дзяцей 35% бацькоў называюць невыкананне рэжыму дня і недахоп начнога сну. Яшчэ 30% скардзяцца на цяжкасці ў вывучэнні пэўных прадметаў. Працяглае знаходжанне дзіцяці за камп'ютарам адзначае кожны чацвёрты з бацькоў. Пры гэтым палова апытаных бацькоў, як высветлілася, наогул не заўважаюць, што іх дзеці стамляюцца....

Святлана Уклейка праінфармавала, што гэта пытанне будзе абмяркоўвацца комплексна на сумеснай з Міністэрствам аховы здароўя калегіі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Фота слова Яўгена ПЯСЕЦКАГА

# «Я НЕ САМОТНЫ, Я КНІГУ МАЮ...»

Сто гадоў таму, раніцай 25 мая ў Ялце перастала біцца сэрца беларускага паэта Максіма Багдановіча. Ён пакінуў спадчыну — свае прароцкія вершы. У той далёкі дзень побач з ложкам смяротна хворага паэта засталася ляжаць кніга, на якой была напісана адзіная страфа развітання:

*«У краіне светлай, дзе я ўміраю,*
*У белым доме ля сіняй бухты,*
*Я не самотны, я кнігу маю*
*З друкарні пана Марціна Кухты».*

Пры жыцці Максіма Багдановіча выйшаў толькі адзін зборнік яго вершаў. Малады паэт лічыў за гонар мець гэтую кніжку са 117 старонкамі.

Пра сучасныя выданні твораў геніяльнага паэта, пра ўвасабленне яго вершаў і думак у розных відах мастацтва вядома шмат. Партрэт Багдановіча напісаны літаратарамі, кампазітарамі, гісторыкамі...

Але кожны вялікі яскравы партрэт складаецца з мноства маленькіх сціплых штрыхоў.

Днямі на адной з міжнародных выставак у Мінску я зрабіў фотаздымак унікальнай кнігі, якая парадавала бы Максіма не меней за іншыя друкаваныя выданні. Гэта кніга была саматробная.

Я дазнаўся, што над такім рэдкім выданнем папрацавала Святлана Іванова, бібліятэкар з аграгарадка Суботнікі Іўеўскага раёна. Убачыцца з ёй не атрымалася, але па тэлефоне мы паразмаўлялі. Святлана расказала, што кнігу любімага паэта яна рабіла, выкарыстоўваючы свае здольнасці ў вышыванні, стварэнні аплікацыі, маляванні. Усе старонкі кнігі заняў верш Максіма Багдановіча «Слуцкія ткачыхі» і па-мастацку (ад усёй душы!) зробленае афармленне да любімых радкоў.






*Ты не самотны.*
*Твой Край з табою —*
*Той сад вясновы, вятры, аблокі,*
*Нямігі плёскат, бярозак строі,*
*Валошак зоркі... Успамін далёкі...*

*Не ўбачыць кветка тваёй усмешкі.*
*Паэта вусны даўно закуты.*
*Абарвалася зямная сцежка*
*«У белым доме ля сіняй бухты».*

*Не, не самотны. Па волі боскай*
*Ты бачыш Край свой*
*з вышынь халодных —*
*Там вышывае жанчына ў вёсцы*
*Твой верш прарочы*
*між кветак родных.*

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
*pyasecki@zviazda.by*

■ Справы духоўныя

# Праваслаўныя ўшануюць паэта

У ПЕТРА-ПАЎЛАЎСКІМ САБОРЫ АДБУДЗЕЦЦА ПАНІХІДА ПА МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ

**Пачатак памінальнага богаслужэння ў 14.30. Пра гэта паведамляецца на сайце Беларускай праваслаўнай царквы.**

Служэнне паніхіды па Максіму Багдановічу ў найстарэйшым праваслаўным храме сталіцы стала ўжо традыцыйным. Па ініцыятыве Літаратурнага музея Максіма Багдановіча малітвы аб упакаенні душы класіка ўзносяцца ў Петра-Паўлаўскім саборы кожны год.

Ушанаваць памяць паэта, які пайшоў з зямнога жыцця ў 25 гадоў, у сабор прыходзяць прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі і многія мінчане, якія цэняць літаратурную спадчыну Максіма Багдановіча.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ЖЫВЫ БАНК ПРЫРОДЫ

## ЗНАКАВЫ АБ'ЕКТ

Для большасці мінчан і гасцей сталіцы батанічны сад — адно з любімых месцаў адпачынку, куток жывой прыроды ў самым цэнтры мегаполіса. Ён раскінуўся на плошчы больш чым у 90 гектараў. Але насамрэч гэта толькі адзін (знешні) бок медаля.

— Асноўная мэта ўсіх батанічных садоў — захаванне біялагічнай разнастайнасці, — тлумачыць **дырэктар ЦБС, доктар біялагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Уладзімір ЦІТОК.** — Згодна з Указам Прэзідэнта, Цэнтральны батанічны сад Акадэміі навук аб'яўлены аб'ектам нацыянальнага набытку. Гэта і помнік прыроды рэспубліканскага значэння, і помнік ландшафтнай архітэктуры. Мы падтрымліваем банк рэдкіх раслін і раслін, што знікаюць, але наша калекцыя — жывы, дынамічны арганізм: узоры, якія страчваюць сваю запатрабаванасць, не пакідаюць, а найбольш перспектыўныя для дэкаратыўнага і прамысловага кветкаводства застаюцца ў калекцыі. Яны служаць матачнікамі для вытворчасці вялікай колькасці раслiннага матэрыялу.

Летась на базе Цэнтральнага батанічнага саду быў створаны Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дэкаратыўнага садаўладкавання, які павінен паскорыць укараненне ў практыку «зялёнага будаўніцтва» і прамысловага кветкаводства сартоў і гібрыдаў новага пакалення і новых высокаэфектыўных тэхналогій. Увогуле, перад цэнтрам ставіцца шмат задач — ад стварэння генна-інжынерных канструкцый дэкаратыўнасці, пошуку механізмаў устойлівасці і адаптацыі раслін да экстрэмальных фактараў урбанізаванага асяроддзя да распрацоўкі пілотных праектаў азелянення тэрыторый і інтэр'ераў знакавых аб'ектаў у Беларусі. Цэнтр аб'ядноўвае навукова-тэхнічны патэнцыял усіх установ Аддзялення біялагічных навук Нацыянальнай акадэміі навук, шэрагу ўстаноў Аддзялення хіміі і навук аб зямлі і беларускіх ВНУ.

— Планы ў нас амбіцыйныя. Кожны год мы ўводзім па адным аб'екце. Лабараторны корпус біятэхналагічнага комплексу ўжо ўвялі, а ў гэтым годзе спадзяёмся ўвесці ў строй і іншыя яго аб'екты. Магутнасць біятэхналагічнага комплексу па мікракланальным размнажэнні будзе дасягаць 1 мільёна саджанцаў каштоўных ягадных, лекавых, драўняных і кустовых раслін на год. Кланальнае размнажэнне раслін у культуры in vitro павышае эфектыўнасць вытворчасці саджанцаў у параўнанні з традыцыйнымі метадамі ў 8—10 разоў. Акупнасць выдаткаў на стварэнне комплексу складае 2-3 гады пасля яго выхаду на праектую магутнасць, — падкрэслівае дырэктар.

Але бадай што самая амбіцыйная задача — гэта будаўніцтва сучаснага навукова-даследчага і вучэбна-асветніцкага цэнтра «Аранжарэя-2». Яго павінны ўвесці ў строй у 2019 годзе, але будаўніцтву будзе папярэднічаць рэспубліканскі конкурс архітэктурных праектаў, паколькі збудаванне можа стаць адным з сімвалаў горада. Сюды будуць прыходзіць людзі, якія цэняць прыгажосць і хочуць набыць прадукцыю, вырашчаную ў батанічным садзе.

## ЯГАДНАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ

Сёння шмат намаганняў навукоўцаў скіравана на развіццё ягадаводства — новай для Беларусі экспартна арыентаванай і імпартазамяшчальнай галіны. Укараняюцца інтрадуцыраваныя сарты высакарослых буякоў, звычайных брусніц і буйнаплодных журавін. Да таго ж беларускія навукоўцы распрацавалі цікавую тэхналогію аднаўлення тарфянікаў з дапамогай ягадных культур.

— У Беларусі налічваецца каля 300 тысяч гектараў зямлі, якая пацярпела ў працэсе здабычы торфу, — расказвае **загадчык лабараторыі экалагічнай фізіялогіі раслін ЦБС, кандыдат біялагічных навук Аляксандр ЯКАЎЛЕЎ.** — Урадлівасць гэтых тарфяных распрацовак вельмі нізкая, глебы вылучаюцца надзвычай высокім узроўнем кіслотнасці, таму ні сельскагаспадарчыя, ні лясныя культуры расці на іх не могуць. Каб вырашыць гэту экалагічную праблему, мы прапанавалі тэхналогію аднаўлення натуральнай урадлівасці на аснове вырошчвання ягадных культур: журавін, буякоў і брусніц. Яна дазволіць вярнуць землі ў сельскагаспадарчае выкарыстанне, стабілізаваць прыроднае асяроддзе, а таксама атрымаць каштоўныя ягады.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Плантацыю буякоў пасадзілі ў батанічным садзе летась падчас рэспубліканскага суботніка члены Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук. Не загінула ніводная расліна...**

Тэхналогія фітарэкультывацыі тарфяных распрацовак асвойваецца і найбуйнейшымі фермерскімі гаспадаркамі краіны «Ягадка» і «Ягадная паляна». З 75 гектараў выпрацаваных тарфянікаў, дакументальна афармленых і ўзятых у арэнду, 30 гектараў рэкультываваныя пасадкамі буякоў, 9 гектараў — пасадкамі журавін і 6 гектараў пасадак паўночнаамерыканскіх журавін на тарфяным радовішчы «Зеленаборскае» праходзяць цяпер сертыфікацыю на адпаведнасць крытэрыям арганічнага земляробства. Вырошчваліся ў Цэнтральным батанічным садзе на палігоне і трансгенныя буйнаплодныя журавіны: у расліну быў унесены ген для ўзмацнення смакавых уласцівасцяў ягады і ўстойлівасці да захворванняў.

— Але трансгенныя расліны сёння для Беларусі не актуальныя, — падкрэслівае **акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, доктар біялагічных навук, прафесар Уладзімір РАШЭТНІКАЎ.** — Для нас гэта быў мадэльны доследны аб'ект. Навуковыя даследаванні на перспектыву, таму што мы павінны быць кваліфікаваныя ва ўсіх пытаннях, умець выдзеліць патрэбны ген і ўбудаваць яго ў расліну. Працуем, так бы мовіць, на апярэджанне, ствараем калекцыю трансгенных раслін, але адпускаць іх у навакольнае асяроддзе ніхто не збіраецца. У гэтым сёння няма патрэбы, але, хто ведае, можа, калі-небудзь, калі людзі паляцяць на Марс ці адбудзецца прыроды катаклізм, такая патрэба з'явіцца...

## «БЭЗ ПЕРАМОГІ»

— Развіццё батанічнага саду — працэс бясконцы. У нас ёсць бачанне таго, як ён будзе развівацца, аж да 2030 года. Скажу шчыра — нам зусім няпроста адпавядаць тым задачам, якія мы самі перад сабой паставілі, — жартуе дырэктар. — У адрозненне ад іншых навуковых установ, у батанічнага саду ёсць свая спецыфіка. Гэта і пастаянныя метэаралагічныя пагрозы, і ўзрост некаторых нашых раслін. З жахам думаем пра магчымыя наступствы, калі б леташні ліпеньскі ўраган закрануў і нас... Паколькі сад з'яўляецца аб'ектам нацыянальнага набытку і помнікам прыроды, для таго каб спілаваць аварыйнае дрэва і не парушыць пры гэтым закон, нам трэба прайсці аж сем інстанцый. А ўжо каб наноў яго вырасціць...Сёлета з-за халоднай вясны пасунуліся тэрміны цвіцення ўсіх раслін. Той жа бэз адстае на два-тры тыдні. Ад начных замаразкаў цярпелі і нарцысы. Дарэчы, іх у садзе налічваецца больш як 400 сартоў! Даводзіцца змагацца работнікам саду і з такой навалай, як кляшчы і краты. І ўсё гэта таксама кладзецца цяжарам на бюджэт.

Для пастаянных наведвальнікаў батанічнага саду нечаканасцю можа стаць адсутнасць у гэтым годзе льгот на ўваходныя білеты для дзяцей і пенсіянераў. Для ўсіх катэгорый грамадзян (акрамя ветэранаў, інвалідаў і дзяцей да шасці гадоў) устаноўлены адзіны кошт за білет — 6 рублёў.

— Гэта прыкладна 3 долары. Для параўнання: у Маямі кошт білета складае 75 долараў, у Лондане — 18 фунтаў для дарослых. Мы цудоўна разумеем нашы пакупныя здольнасці, таму не павышалі з мінулага года цэны на білеты, а ў якасці кампенсацыі за адмену льгот наведвальнікі змогуць цяпер бясплатна наведваць і наш аранжарэйны комплекс, дзе раней была дадатковая плата, — падкрэслівае Уладзімір Цiток. — У 2012 годзе Цэнтральны батанічны сад наведалі 293 тысячы чалавек за год (максімум складае 5—6 тысяч наведвальнікаў у дзень). Гэта быў самы «ўраджайны» для нас год, а потым намецілася пэўнае зніжэнне. Сёлета плануем выйсці на лічбу у 250—270 тысяч наведванняў.

Для таго каб зацікавіць мінчан, тут будуць на працягу ўсяго сезона праводзіцца дні ірысаў, рададэндранаў, лілій, вяргінь, хрызантэм, выстаўкі сухацветаў і пладоў. 19 мая стартаваў Тыдзень бэзу. Уладзімір Цiток паведаміў, што з удзелам Цэнтральнага батанічнага саду быў распрацаваны і рэалізаваны ўнікальны міжнародны праект «Бэз Перамогі», у ходзе якога былі аднолькавыя айчынныя сарты бэзу, названыя ў гонар герояў Вялікай Айчыннай вайны і месцаў буйных бітваў, закладзены алеі і экспазіцыі гэтых сартоў у гарадах-героях Расіі, Беларусі і Украіны.

А ў пачатку чэрвеня пройдуць юбілейныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да 85-годдзя батанічнага саду. У прыватнасці, міжнародная навуковая канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў 14 краін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Сямейная газета
Выпуск № 10 (77)



## У КОЖНАГА СВАЯ ЧАША

Гэтым разам пачну з анекдота на злобу дня.

Прэстыжна апрануты мужчына трапіў пад дождж. Ідзе па вуліцы ў сваім атласным пінжаку ды лакавых чаравіках злосны-злосны, думае сам сабе: «Што ж гэта за надвор'е, што за дзень такі няўдалы!» Насустрач яму крочыць ускалмачаны дзядзька ў дзіравым касцюме з чужога пляча ды ў адным чаравіку і шчыра ўсміхаецца на ўвесь рот.

— Як ты можаш усміхацца? Такое жудаснае надвор'е! Ды яшчэ і чаравік згубіў!

— Ды не згубіў я яго... А знайшоў!

...Год таму знаёмы, які выхоўвае дачку з ДЦП, згубіў тэлефон. А там усе рэабілітацыйныя праграмы для дзяўчынкі. Дзмітрый адразу ж развесіў на кожным слупе аб'яву: хто знойдзе, гарантую годную ўзнагароду. Але так ніхто і не адгукнуўся... І вось праз нейкі час мужчына падзяліўся навіной: маўляў, здарыўся цуд. Трапілі з дзецьмі ў аварыю. Усе засталіся жывыя, дзякуй богу. Аўтамабіль аднаўленню не падлягае. Але знайшоўся тэлефон — ён, аказваецца, заваліўся за крэсла ў машыне. Як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце памагло.

Я ўжо даўно заўважыла, што вельмі часта перамены да лепшага адбываюцца праз горшае. Тым не менш, калі чарговы раз пачынаю ныгаць, што штосьці адбылося не так, як бы мне хацелася (ці чую ад іншых «Божа, за што мне гэта?»), як правіла, успамінаю Людмілу Іванаўну. І яе заўсёдную ўсмешку. Зараз жанчыне 60. Яна займаецца любімай справай і вандруе па свеце разам са сваім другім мужам. Я ніколі ў жыцці не чула, каб гэтая жыццялюбка скардзілася на свой лёс. Хоць ён у яе вой які няпросты. Калі, здаецца, жыццё толькі пачыналася, у першага мужа здарыўся інсульт, паралізавала палову цела. Многія «добразычліўцы» раілі жанчыне адвезці яго да маці, а самой пачаць новае жыццё. Але Людміла Іванаўна, па-першае, кахала мужа. Па-другое, ні кроплі не сумнявалася, што калі Бог пасылае нейкае выпрабаванне, гэта не проста так. Яна аддана даглядала мужа больш як 10 гадоў, да самага апошняга яго дня. І ніколькі не пашкадавала пра гэта. Больш за тое, перакanана, што, калі б адмовілася ад выпрабавання, то яе далейшы лёс не склаўся б так добра.

А нядаўна сяброўка напісала на сваёй сцяне ў сацыяльных сетках пост у тэму. «Укладзі меч у ножны. Няўжо я не стану піць чашу, якую даў мне Айцец?» Так Ісус сказаў Пятру, калі той адсек вуха рабу першасвятара. Ісус ведаў, што з ім павінна адбыцца (Пётр з Іудам прыйшлі ў сад, каб схапіць яго), і хацеў выканаць Божую волю, нягледзячы на пакуты, якія яго чакалі. Таму што Божая задума — гэта заўсёды найлепшае, што з намі можа адбыцца. І я, у надзеі на Яго, п'ю сваю чашу. Яна не напоўнена напалову, як у аптыміста, не пустая напалову, як у песіміста. Яна заўсёды поўная, і выпіць да дна яе немагчыма. Яна бясконцая, яна неспусташальная. Укладзі меч у ножны — не змагайся з Богам. І пі сваю чашу, таму што табе яе даў Айцец Нябесны. Не зайздросці, не прагні памяняць на лепшую. Таму што ўсё найлепшае, што ён падрыхтаваў іншаму, не падыходзіць для цябе. Чужая чаша ў тваіх руках адразу страціць сваё ўласцівасці. Пі сваю, бо Ён рыхтаваў яе менавіта для ЦЯБЕ».

— Вось умееш ты так своечасова спыніць стужку, — адрэагавала на гэты пост агульная знаёмая. — Дзякуй за патрэбныя словы.

— Гэта не я. Гэта Ён, — адказала Таня.

— Твая чаша — нагадаць!

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■ Самы важны дзень

# Рыцары ў даспехах і старадаўнія танцы

### Як арганізаваць стылізаванае вяселле



**Вяселлем з лімузінамі і феерверкам ужо амаль нікога не здзівіць. Іншая рэч, калі выкупляць нявесту дапамагаюць сапраўдныя рыцары ў даспехах, а ў самы разгар весялосці на свяце з'яўляецца... Святая Інквізіцыя.**

**Пра моду на стылізаваныя вяселлі, старабеларускія абрады і сумяшчэнне несумяшчальнага гутарым са Змітром САСНОЎСКІМ, музыкантам, стваральнікам і кіраўніком гурта «Стары Ольса», а цяпер яшчэ і дырэктарам святочнага агенцтва «Арт-Нос».**

***— Колькі вы ўжо займаецеся арганізацыяй свят?***

— Усё пачалося ў 2005 годзе. Тады мы з сябрам кіравалі турагенцтвам «Гісторыя-Тур», якое спецыялізавалася на гістарычным турызме. Першым святам, якое мы арганізавалі, стала вяселле ў сярэднявечным стылі. Захапленне гісторыяй і старадаўняй музыкай, арганізацыя фестываляў — усё няўхільна вяло да гэтага новага занятку.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Інклюзіўны праект

# «ГЭТА ЯК ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПЕРШЫХ АКУЛЯРАЎ»

### Беларускі дызайнер выпусціла адзенне для інвалідаў-калясачнікаў

**20 тысяч чалавек. Гэта насельніцтва невялікага раённага гарадка, Пастаў ці Мар'інай Горкі напрыклад. Столькі ж беларусаў маюць інваліднасць і перасоўваюцца ў калясках. Ім не хапае пандусаў у горадзе, выключальнікаў святла на ўзроўні іх рукі і зручнага адзення. Бо тое, што прадаецца ў крамах, мае крой і функцыянальнасць для здаровага чалавека, а калі ўвесь дзень праводзіш седзячы, стандартныя джынсы ўжо не здаюцца такімі камфортнымі. Блогер Аляксандр АЎДЗЕВІЧ і дызайнер Кацярына ЦІКОТА вырашылі выправіць сітуацыю і распрацавалі калекцыю для калясачнікаў.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

# «Хацелі хлопчыка, а атрымалі дзяўчатак-трайнят»

## Маці дарослых дачок пра хітрыкі выхавання і крызіс патрыярхальнай сям'і

**Моцная і незалежная — гэта якраз пра нашу сённяшнюю гераіню. Яна можа пахваліцца не толькі поспехамі чатырох дарослых дачок. За плячыма жанчыны — сорак гадоў шлюбу з адным мужам, дваццаць гадоў працы кіраўніцай загса і чатыры ўласныя кнігі пра мастацтва жыць. Нэлі Ільінічна ўпэўнена: у 60 гадоў жыццё толькі пачынаецца. Яна чытае літаратуру па псіхалогіі і квантавай фізіцы, вывучае англійскую мову, падарожнічае па свеце, праводзіць кансультацыі па сямейным дабрабыце. Як не згубіць індывідуальнасць і заставацца цікавай мужу і дзецям? Як адшукаць баланс паміж соцыумам і сям'ёй? Сакрэты паспяховага выхавання і шчаслівага шлюбу шукаем у шчырай размове з Нэлі КСЯНЕВІЧ.**


Сужэнцы КСЯНЕВІЧЫ са старэйшай дачкой Аленай і ўнукам.

Прыкладам ідэальнай сям'і для Нэлі з самага дзяцінства служылі бацькі. Тата бясконца любіў дачку і сына, а маці навучыла стылю, уменню апранацца, мастацтву. Бацькі жылі сціпла, але дом заўсёды быў адчынены для гасцей.

— Калі я паступала ў БДУ на гістфак, мяне абакралі. Укралі ўсе грошы, экзаменацыйны ліст з пяцёркай. Я сяджу, плачу. Падыходзіць незнаёмы хлопец і пытае: «Чаго слёзы льеш?» Расказала. Тады ён узяў мяне за руку, даў грошай на тэлеграму бацькам, завёў у дэканат, дзе выпісалі дублікат экзаменацыйнага ліста... А зараз гэта мой муж.

З таго часу мужчына вядзе каханую за руку па жыцці. Першую дачку сужэнцы нарадзілі яшчэ студэнтамі. Потым трапілі па размеркаванні ў Горкі: Аляксандр — выкладаць у сельгасакадэміі гісторыю КПСС, Нэлі — навуковы атэізм. Сёння такіх дысцыплін няма, але ў мужа захавалася цікавасць да палітыкі, а ў жонкі — да гісторыі і рэлігіі.

### I. За дзяцей нельга прымаць рашэнні: гэта іх жыццё

На пятым курсе вучобы маладыя з дзіцем пераязджаюць да бацькоў хлопца ў Жодзіна. У хуткім часе ім прапануюць абмен бацькоўскай кватэры на дзве асобныя ў Горках. У 70-я пра такую раскошу можна было толькі марыць.

— Памятаю, як муж прыехаў пасля размовы з бацькамі. Заходзіць і кажа: «Мы з мамай і татам вырашылі, што лепш жыць у Жодзіне», — адчуваецца прыкрасць у голасе Нэлі Ільінічны. — Тут я абурылася: мой лёс вырашаюць без мяне! Было вельмі крыўдна, ледзь не развяліся. Такія рэчы павінны вырашацца сумесна.

Тады ў Жодзіне не атрымалася знайсці працу па спецыяльнасці. Старшыня гарвыканкама прапанаваў Нэлі месца інспектара па рабоце з дэпутатамі. Праца аказалася выдатнай школай для маладога спецыяліста. А ў 25 гадоў яна ўзначаліла мясцовы загс.

Тут затрымалася на 20 гадоў. За гэты час перад вачыма прайшлі безліч лёсаў, пра якія захацелася напісаць. Так выйшла чатыры кнігі. Зараз Нэлі Ільінічна працуе над пятай. Яна пазіцыянуе свае кнігі як дапаможнікі пра тое, як жыць лёгка, радасна і весела, як пераводзіць мінусы ў плюсы.

Праз сем гадоў пасля першага дзіцяці бацькі задумаліся пра хлопчыка, але бог даў адразу трох дзяўчатак. Урачы разгледзелі шматплоднасць на вялікіх тэрмінах. Яны асцярожна намякалі на аборт па паказаннях: імавернасць невыношвання вялікая, а нарадзіцца малыя маглі з парушэннямі.

— Трайняты з'явіліся на свет сямімесячнымі. Найбольш давялося цярпець Злаце. Яна за паўтары гады перанесла тры аперацыі, — расказвае маці. — Цікавосткі таксама былі. Ад хроснай матулі трайнят я потым даведалася, як Саша адрэагаваў на навіну пра дзяўчатак: ён увесь аж збялеў ад шоку. Затое старэйшая Аленка насілася па доме ад шчасця, калі пачула адразу пра трох сястрычак.

### II. «У выхаванні малых неабходна адчуваць дзве рэчы: 1) Колькі самастойнасці дзіця гатова ўзяць на дадзены момант і 2) Калі трэба жорстка праявіць сябе як бацькам»

Сёння дочкі Ксяневічаў — грамадзяне свету і гонар бацькоў. Злата выдатны трэнер па фітнесе і мадэльер. Распрацоўвае лінію адзення для цяжарных, піша абстрактныя карціны і робіць упрыгажэнні.

Аліса вучылася на журфаку ў эканамічным універсітэце ў Мінску, на псіхолага — у ЗША. Засталася жыць у Злучаных штатах, напісала кнігу пра Нью-Ёрк.

Старэйшая Алена вывучылася ў лінгвістычным універсітэце ў Мінску. Зараз выкладае англійскую мову амерыканцам у Філадэльфіі.

Іва вучылася ў Англіі і Францыі і працавала цырульнікам, а потым пачала рабіць капелюшы. У мінулым годзе дзяўчына ўвайшла ў топ-15 самых маладых дызайнераў свету і паказвала калекцыю ў Мінску, Маскве, Шан-Хаі і Лондане. Жыве ў Расіі.



Нягледзячы на знешняе падабенства, у кожнай з трайнятак — свой лёс, сваё жыццё.

### III. Узор для дзяўчат — тата

— Я ўзяла актавыя запісы за 40 гадоў у загсе і пагледзела адзнакі пра разводы і адзінокае мацярынства, — Нэлі Ксяневіч дзеліцца выпадкамі з практыкі. — Атрымліваецца, калі бабуля адзінокая, то яе дачка і ўнучка таксама. Калі ў дзяўчыны няўдалы бацька, а маці гадуе яе адна, вялікая імавернасць, што яна будзе нешчаслівай у шлюбе.

У сям'і дзіця атрымлівае два віды любові. Мацярынскую безумоўную, калі любіш малога такім, які ён ёсць. І бацькоўскую заслужаную: тата любіць дзіця за поспехі, і гэта нармальна.

Ад матулі, у сваю чаргу, дзяўчаты вучацца жыць у ладзе са сваім узростам і добра выглядаць, правільна гаварыць з мужчынамі: не загадам, а просьбай. Неад'емнай з'яўляецца інтэлектуальная праца, калі бацькі чытаюць і глядзяць тое, чым цікавяцца дзеці, каб быць «у тэме». У адказ дзеці могуць скласці кампанію бацькам на канцэрце класічнай музыкі ці балеце.

### IV. Час ад часу трэба, каб дзіця адчула сябе цэнтрам сусвету

Калі ў сям'і адно малое, уся ўвага і клопат аддаюцца яму. Небяспека тут у перадазіроўцы. Што, калі дзяцей некалькі?

— Вельмі важна ўсю ўвагу пераключаць на адно дзіця. І так па чарзе, — дзеліцца сакрэтамі выхавання матуля. — У псіхалогіі такі метад атрымаў назву «пільная ўвага».

### V. Жанчыну, якая цалкам растварылася ў сям'і, непазбежна чакае крызіс

Пры поўнай аддачы сябе сям'і жанчына стварае максімальна камфортныя ўмовы для дзяцей і мужа. Пры гэтым губляецца ўласная індывідуальнасць. Яна становіцца проста нецікавай ні малым, ні каханаму. Так лічыла Нэлі Ільінічна, але аднойчы перажыла не вельмі прыемны момант, калі стала «не такой» для дачок:

— У дзяцінстве мае трайняты сябравалі з дзяўчынкай. У той была класічная сям'я, дзе маці гатавала сняданкі, абеды і вячэры, прыходзіла з працы а пятай гадзіне. Я ўсё жыццё была нестандартнай і вельмі актыўнай мамай. На дзяцей заставалася мала часу. Я пакідала ім грошы і казала, што купіць і як прыгатаваць. Аднойчы адна з дачок заявіла: хачу маму, як у сяброўкі.

Праз шмат гадоў Нэлі пагаварыла з дачкой. Тая сказала, што не памятае такога і што вельмі ганарыцца матуляй. Жанчына ўпэўнена, што калі нічога не робіш для соцыуму, то рана ці позна станеш нецікавай для ўласных дзяцей. Іншая справа — знайсці прапорцыю паміж грамадскай актыўнасцю і сям'ёй, каб не абдзяліць мужа і дзяцей.

### VI. Сям'я XXI стагоддзя — раўнапраўная, як два крылы

У сучасных рэаліях яшчэ сустракаюцца выпадкі, калі мужчына зарабляе прыстойныя грошы і прымушае жонку сядзець дома з дзецьмі. Як ні круці, патрыярхальныя сем'і цяжкавыжывальныя. Жанчына ў іх становіцца часткай інтэр'еру, а ў мужчыны з'яўляецца інтарэс, як правіла, на рабоце. Нэлі Ксяневіч за раўнапраўную сям'ю:

— Калі абодва сужэнцы актыўныя, яны застаюцца цікавыя адно аднаму. У нас шмат дзяўчат за 30, якія жаляцца на адсутнасць вартых мужчын. А што наконт уласнай самадастатковасці? Фінансавай, разумовай, інтэлектуальнай?... Па закону парадоксу самадастатковая жанчына будзе цікавая толькі такому ж мужчыне.

### VII. «Варта як можна пазней дапусціць сітуацыю, калі дзеці вымушаныя цябе ўсынавіць»

— Мы пачынаем раздражняць сваіх дзетак, калі ім спаўняецца 7—8. У 14 яны скідваюць цябе з п'едэстала, бо на першае месца выходзіць аўтарытэт сяброў і настаўнікаў. У 21 год яны ўжо маюць уласнае светаўспрыманне, і адносіны з бацькамі выбудоўваюцца ў раўнапраўныя. Гэты баланс, калі яны ў нейкіх сферах ведаюць больш, а штосьці мы падкажам, патрэбна ўтрымаць як мага даўжэй, — раіць жанчына. — Рана ці позна надыдзе момант, калі дзеці пасадзяць нас у «партэр» — галоўнае, каб не выгналі з залы.

### VIII. Дзіцяці патрэбныя выразныя рамкі: што рабіць можна, а што нельга

Нэлі Ільінічна згодная, што караць дзяцей... трэба. Але нараўне з пакараннем павінна быць заахвочанне. У Ксяневічаў ёсць некалькі правілаў, якія нельга парушаць: дома ніхто не крычыць і не крытыкуе. Але можна тупаць нагамі ў адведзеным месцы ці пайсці ў іншы пакой, каб астыць.

Дочкі ў дзяцінстве прыдумалі цікавую гульню РІЗ (развіць і змяніць). Што гэта такое? Калі сям'я збіраецца разам, кожны называе тры рэчы, якія падабаюцца ў чалавеку, і адну, якую трэба развіваць. «Неяк падчас гульні малыя мне сказалі: матуля, ты ціснеш, — прыгадвае Нэлі. — Ніколі гэтага не адчувала, а потым сама заўважыла. А аднойчы яны мне сказалі: мама, трэба мяняць абутак. Пайшлі па новы».

— Можна сказаць: я цябе буду любіць, але не буду табой ганарыцца. Таксама мы абмяжоўвалі месца перамяшчэння. Старэйшая дачка нават цяпер асцерагаецца кута ў кабінеце мужа, — дзеліцца Нэлі Ксяневіч дзейснымі метадамі пакарання. — Яшчэ я магла замаўчаць. Але мне за гэта сорамна. Лепш ужо павышаць голас, каб дзеці ведалі, у чым праблема.

### IX. Варта растлумачыць дзецям, што ніхто не павінен іх фінансаваць пасля 18 гадоў

Задача бацькоў — навучыць не баяцца цяжкасцяў. А як дзеці будуць іх перадольваць — рэч іншая. Нэлі лічыць, што бацькі павінны даць добрую адукацыю. Далей — справа за дзецьмі:

— Усе мае дочкі з паўналецця зарабляюць самі. Бываюць, вядома, выпадкі, калі хочацца даць ім грошы, але тут удзячная мужу: спыняе. Мы можам пазычыць нейкую суму без тэрмінаў і працэнтаў, але з абавязковым зваротам. Мяне здзіўляюць сучасныя дарослыя дзеці, якія не саромеюцца забіраць паўпенсіі бацькоў. Яны не здольныя спраўляцца з жыццёвымі абставінамі. Ад гэтага сумна.

Сёння Нэлі Ільінічна з мужам жывуць у абдымку са скайпам і тэлефонам. Са Штатаў дочкі прыязджаюць раз на паўгода, Іва з Расіі — раз на тры месяцы. «Калі дзеці падрастаюць і кола клопатаў звужаецца, надыходзіць час пажыць для сябе, — усміхаецца Нэлі. — Нам з Сашам няма калі сумаваць: у кожнага свая праца, а ўвечары — дзве традыцыйныя партыі ў нарды, прагулка па парку з сабакам і бясконцыя размовы пра жыццё. Што яшчэ патрэбна для шчасця?»

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**
*veronika.ulasevich@mail.ru*

■ Чалавек — чалавеку

# ЯК КАШУЛЯ Ў ПОЛІ ВЫРАСЛА

***Добры дзень, дарагая рэдакцыя!***
***Чытаю ўважліва «Сямейную газету», хоць мне гэта ўжо, можа, і не трэба, бо я з 1935 года. Але раблю гэта па звычцы, па традыцыі, дзялюся прачытаным з роднымі і знаёмымі. Дык вось, раздумваю, што самае старажытнае, самае нявывучанае, вечна патрэбнае ў жыцці — гэта выхаванне чалавека ад нараджэння да старасці. Нездарма ў народзе кажуць: век вучыся, а дурнем памрэш. Можа, таму ні з якім працэсам не было столькі маніпуляцый, рэфармавання, як з адукацыяй і выхаваннем — і ўсё каб лепш. Сама ўсё жыццё прапрацавала настаўніцай у школе, таму ведаю гэта не па чутках.***

Але ўсё ж першаснай і пастаяннай школай выхавання з'яўляецца сям'я. Адсюль пачынаецца жыццёвы ўклад і ўбіраецца вопыт кожнага. У наш час яшчэ з'явіліся тэхнічныя сродкі, якія ўзялі на сябе ролю дапамогі сям'і ў выхаванні. І ў першую чаргу — тэлевізар. Дзеці ўжо з двух, і нават раней, гадоў не адрываюцца ад экрана, калі паказваюць мульцікі. Тут цудоўныя карцінкі, зразумелы змест — усё гэта бярэ ў палон увагу малых.

**«А дзеці ж цікаўныя. Што запомняць у раннім маленстве — усё жыццё будуць помніць».**

У мяне ёсць праўнучак Мікітка. Яму 4 гадкі. О! Колькі ён можа расказаць казачак, якія словы мудрагелістыя ўжывае, проста дзіву даешся. Ды не проста перакажа, а нават даслоўна змест помніць... Вось і пішу гэты ліст з нагоды, што хачу паразважаць пра мульцікі, бо яны аказваюць дужа вялікі ўплыў на дзяцей. Яшчэ і мае дзеці, сын ды дачка, з нецярплівасцю чакалі трансляцыі «Ну, пачакай!», ведалі і цытавалі твор. Дык у мяне жыве такая думка: няхай бы гэтыя мульцікі ўключалі ў сябе навучальны змест. Напрыклад «Як расце хлеб», «Як каша на стол прыйшла». Гэта ўсё можна зрабіць займальна і цікава, запамінальна. Часткова гэта ёсць у форме казкі «Пасадзіў дзед рэпку», «Машачка і мядзведзь» і інш. Але гэта мізэр для выхавання. Мне яшчэ прыйшла гэта думка вось чаму: я ўспомніла хрэстаматыю майго дзядулі (шкада, што не захавалася). У ёй было ўсім вядомае апавяданне «Як кашуля ў полі вырасла». Апавяданне было багата ілюстраванае, і як цяпер бачу малюнак дзяўчыны ў чырвоным сарафане, якая прадзе лён на верацяно. У апавяданні і па малюнках бачым увесь працэс ад зярняці да сувою палатна. Капіраваць не абавязкова, а стварыць арыгінальнае можна. А то дзеці вырастаюць і элементарных рэчаў не ведаюць.

Выкладчык біялогіі расказваў, што некаторыя студэнты не маглі адрозніць колас пшаніцы, ячменю, жыта і вучыліся гэтаму ў ВНУ. А паспрабуйце запытацца ў падлетка, з якога зярняці атрымліваюць проса або з якой культуры робяць ячныя крупы, — упэўнена, не скажуць.

А дзеці ж цікаўныя. Што запомняць у раннім маленстве — усё жыццё будуць помніць. Прыехаў мой Мікітка да мяне летам, і пайшлі мы маладую бульбачку выбіраць. Я расказваю яму: пасадзіш вясной адну невялікую бульбіну, а з яе вырасце во колькі, можна двум чалавекам пад'есці.

— А як маю машынку пасадзіць, таксама вырастуць машынкі?

— Толькі з жывога можа вырасці, а машынку чалавек зрабіў, яна нежывая.

Дзівіцца ўнучак, што боб ці фасоліна жывыя...

Трэба дзецям паказваць, як што расце, пра зямельку-карміцельку расказваць, ашчаднасці вучыць. Прагрэс прагрэсам, добра і робаты, і машыны, а зямелька і ўсё жывое найперш дабрыню любяць. Неабходна знаёміць з гэтым дзяцей з самага малога ўзросту. Бо калі пачынаюць вучыць батаніку, то яна павінны паглыбляць веды, а не даваць азы. «Зямля — аснова ўсёй Айчыне», — казаў Колас. Яна нас корміць і поіць.

**Яўгенія КУЛЕВІЧ,** *в. Сялец, Смаргонскі раён*

■









**Ілюстрацыі да апавядання Канстанціна Ушынскага «Як кашуля ў полі вырасла».**

■ Маміны дзённікі

## 20 лайкаў... за суп

Еду ў краму, жартую з Данем (4 гады):
— Ты тату і дзядулю дагледзіш?
— Так! — узрадаваўся малы. — А што ім нельга даваць? Піва?

☺☺☺

*— Даня, ты будзеш есці суп?*
*— Не, я не галодны.*
*— А піцу будзеш?*
*— Так!*
*— Ты ж не галодны!*
*— Гэта ж не ежа, а задавальненне!*

☺☺☺

Падчас дыеты сыну забаранілі есці цукеркі. Убачыў, як я дастала адну.
— Адкуль узяла? З майго падарунка?
— Не, са свайго. А што, з твайго нельга?
— Можна, але ж я хвалююся, што пакуль мне зноў дазволяць есці цукеркі, дык ніводнай не застанецца...

☺☺☺

*— Мама, ты будзеш нас са святам віншаваць? — пытаецца зранку Даня?*
*— З якім? — прыкідваюся, што не зразумела.*
*— З Днём абаронцаў Айчыны, — горда кажа малы.*
*— А што такое Айчына?*
*— У таты спытай, ён жа ў арміі служыў.*

☺☺☺

Пачала рабіць ранішнюю зарадку.
— Далучайся да мяне, — запрашаю малога.
— Не, дзякуй, у мяне ўсё ў парадку!

☺☺☺

*— Ну, як табе? — пытаюся ў Дані пра суп.*
*— Стаўлю табе 20 лайкаў!*

**Запісала Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ**

■

■ Будзьце пільныя!

# ФЕЯ АГНЮ, СІНІ КІТ ДЫ РУЖОВАЯ ПАНТЭРА:

### бяскрыўдныя гульні ці смяротная небяспека?

**У суседняй Расіі многія бацькі занепакоены недзіцячай гульнёй «Сіні кіт», якая забірае жыцці падлеткаў. Хлопчыкі і дзяўчаткі ва ўзросце 12—16 гадоў працягваюць паддавацца на інтэрнэт-правакацыю і канчаюць жыццё самагубствам. Аднак «Сіні кіт», «Ружовая пантэра» і іншыя аналагі — не адзіная пагроза сучаснасці. У той час калі падлеткаў прымушаюць прачынацца а 4.20 раніцы і рабіць з сабой страшныя рэчы, жахлівыя паведамленні пачалі атрымліваць і вучні малодшых класаў.**




Па інтэрнэце стаў распаўсюджвацца малюнак, які нібыта тлумачыць, «як стаць Феяй агню». «Правілы» простыя. Для таго каб стаць «сапраўднай Феяй», трэба ўстаць апоўначы, абысці пакой тры разы і прамовіць «чароўныя словы». Далей ціха прайсці на кухню, каб ніхто не пачуў, інакш (папярэджваюць аўтары гэтай «магіі») тыя словы не падзейнічаюць. Апынуўшыся на кухні, трэба ўключыць газавую пліту — усе чатыры фаеркі, але не запальваць іх. Засталося самае лёгкае — легчы спаць. Пасля гэтага абраду дзецям абяцаюць, што пойдзе «чароўны газ». Менавіта ён дапаможа «ператварыцца ў сапраўдную Фею агню».

Не ведаю, як у вас, а ў мяне мурашкі па скуры пасля прачытанага. Пра гэтую жахлівую гульню я даведалася зусім нядаўна ад малодшага брата, які вучыцца ў 3 класе. На днях ён вярнуўся дадому са школы і расказаў, што яго аднакласніку прыйшоў ад невядомага адпраўшчыка дзіўны малюнак. Той хлопчык паказаў яго сваім бацькам і, дзякуй богу, з ім нічога не здарылася.

Псеўдамагі, якія ажыццяўляюць рассылку, карыстаюцца наіўнасцю малых, іх верай у цуды і жаданнем наблізіцца да любімых персанажаў з мультфільмаў і казак. На жаль, у наш час многія дзеці ўжо з шасці гадоў маюць вольны доступ да інтэрнэту, таму знайсці іх у сацыяльных сетках нескладана.

Каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў, бацькам, на мой погляд, недастаткова проста правяраць дзіцячыя паведамленні. Трэба быць больш уважлівымі да сваіх сыночкаў і дачок, больш размаўляць з імі. Не толькі тлумачыць правілы бяспечных паводзін на кухні, але і расказваць пра інтэрнэт: чаму там можна даваць, а што лепш катэгарычна пазбягаць. Мама і тата павінны быць сябрамі і галоўнымі дарадцамі свайму дзіцяці. Тады яно будзе дзяліцца з імі сваім патаемным. Але разам з тым варта заўсёды быць напагатове. Невядома, што яшчэ могуць прыдумаць зламыснікі.

**Дар'я ГАЛОЎЧЫЦ,**
**вучаніца 10 класа СШ №54**
**г. Мінска**

■

# «ГЭТА ЯК ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПЕРШЫХ АКУЛЯРАЎ»




Сябры віншуюць дызайнера Кацярыну ЦІКОТУ з запускам новага праекта.

**На конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend праект TIKOTA INCLUSIVE атрымаў Гран-пры і Прыз глядацкіх сімпатый.**

## Кошт павінен быць даступным

Аляксандр Аўдзевіч многім вядомы як падарожнік, які на ручным веласіпедзе праехаў цераз усю Еўропу — амаль чатыры тысячы кіламетраў ад Ліды да Партугаліі. Калі сустракаемся з Сашам, на ім байка і спартыўныя штаны — адзінае, у чым інвалід-калясачнік можа зручна сябе адчуваць.

— У маім гардэробе амаль усё такое, — прызнаецца малады чалавек.

За мяжой спецыяльнае адзенне выпускаюць. Але ёсць праблемы. Па-першае, цана: штаны каштуюць 70 еўра. Па-другое, знешні выгляд: рэчы функцыянальныя, але пра мінімальную адпаведнасць модзе і размовы не ідзе.

Пра тое, што ў Беларусі неабходна стварыць лінейку адзення для калясачнікаў, Саша думаў даўно. А ў снежні трапіў на паказ у рамках Сусветнага дня барацьбы са СНІДам па праграме ААН, дзе і пазнаёміўся з Кацярынай Цікотай. Прапанаваў дызайнеру сваю ідэю, і тая адгукнулася.

Першыя мадэлі тэсціраваліся на фокус-групе.

— Як калясачнікі ўспрынялі прапанову паўдзельнічаць? А вы ўявіце, што чалавека, які дрэнна бачыць, запрашаюць на прэзентацыю першых у свеце акуляраў. Няхай яны нават няякасныя будуць — гэта ж прарыў! Так і тут. Крута, што за гэту тэму ўзяліся, — лічыць Аляксандр.

Па задумцы аўтараў праекта, рэчы павінны быць даступнымі па кошце для мэтавай аўдыторыі. Для калясачніка цана на штаны складзе рублёў 55, для звычайнага чалавека, які захоча набыць штосьці з гэтай жа калекцыі для сябе, — удвая даражэй (так ён часткова аплаціць пакупку інваліда і падтрымае праект).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)



Блогер Аляксандр АЎДЗЕВІЧ на паказе ў аэрапорце дэманструе адзенне для калясачнікаў.

Фота Надзеі БУЖАН.

Падарожнік упэўнены, што інклюзіўнае адзенне можна ўвесці ў моду. «А што, сталі ж папулярнымі штаны з нізкай таліяй? Чым нашы горшыя?» — аргументуе Саша Аўдзевіч.

## Штаны і 18 адрозненняў

Кацярына Цікота прызнаецца, што для яе пашыў калекцыі для калясачнікаў — складаны вопыт. Каб вы разумелі: спецыялізаваныя штаны маюць 18 (!) адрозненняў ад стандартных. Дадатковыя вытачкі, наканеннікі... У інтэрнэце, вядома, знайшліся відэаролікі па стварэнні інклюзіўных рэчаў, але там улічвалася толькі 4-5 параметраў, таму многае прыйшлося распрацоўваць самастойна.

Дызайнер улічыла асаблівасці фізіялогіі і лад жыцця мэтавай аўдыторыі. Напрыклад, тое, што адзявацца трэба седзячы. У штанах не павінна быць задніх кішэняў (у іх няма сэнсу), а пярэднія трэба сканструяваць па-іншаму (напрыклад, прышыць ніжэй калень), каб было зручна класці ключы, тэлефон. Пояс ззаду мусіць быць вышэйшым, а маланка спераду значна даўжэйшая. На сукенках — ніякіх засцёжак на спіне. Лямкі — без металічных дэталяў, на рызінцы (каб было зручна адзяваць людзям з парушанай маторыкай).

Грошы на першую партыю знайшліся дзякуючы спонсару — анлайн-рэсурсу па продажы білетаў tikets.by. Паказ калекцыі прайшоў у Нацыянальным аэрапорце Мінск. Паралімпійцы, медыяперсоны і проста зацікаўленыя людзі прадставілі на подыуме стыльныя і функцыянальныя камплекты. Дызайнер папярэджвае: гэта пробныя мадэлі, яшчэ не дасканалыя. Фокус-групе трэба спачатку нейкі час панасіць іх, каб зразумець, ці ўсё зручна.

Пакуль лінейка ўключае ў сябе штаны-камбінезоны і сарафаны для паўсядзённага нашэння. У далейшым з'явіцца і адзенне дзелавога стылю.

— Вельмі важна давесці справу да канца, — кажа Кацярына Цікота. — Каб калекцыю пусціць у жыццё, неабходна падтрымка леграма. Вельмі спадзяёмся, што знойдзецца зацікаўленае дзяржаўнае прадпрыемства, якое возьмецца за вытворчасць інклюзіўнага адзення. Праект сацыяльны, таму добра было б, каб яно забяспечыла калясачнікам яшчэ і працоўныя месцы, каб яны самі маглі ўдзельнічаць у стварэнні рэчаў, зручных для сябе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** lubneuskaya@zviazda.by

**Яўген ШАЎКО, старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў:**

— Я ў калясцы ўжо 16 гадоў. Па сабе ведаю, што зручнае адзенне знайсці складана. Перад тым як Кацярына пачала ствараць калекцыю, на сайце асацыяцыі мы правялі апытанне. Прасілі калясачнікаў пазначыць свае праблемы, прапановы. Вельмі шмат нюансаў. Напрыклад, «шыйнікі» — гэта асобная катэгорыя: у іх горш працуюць рукі, цяжка зашпіляць гузікі.

Што да кошту, то, лічу, павінны быць розныя цанавыя сегменты. Самыя простыя рэчы, даступныя большасці, і рэчы прэміум-класа, з цікавым дызайнам. Спадзяюся, што будуць распрацаваны тыпавыя памеры, каб людзі маглі заказаць адзенне праз інтэрнэт.

---

■ Карысна ведаць

# Тайм-менеджмент, або Вучымся ўсё паспяваць



**Уявіце, што кожны дзень у банку вам выдаюць 86400 беларускіх рублёў і кожны вечар сума цалкам абнуляецца. Як бы вы паступалі? 100% кожны рубель стараліся б патраціць! Вось так і з часам — штодзень нам выдаюць 86400 секундаў, і кожны раз да канца дня яны знікаюць, нягледзячы на тое, скарысталіся імі ці не. Дык чаму ж мы так не беражом кожную секунду, хоць у глыбіні душы разумеем, што час нашмат даражэйшы за любыя грошы? І пры гэтым яшчэ ўмудраемся скардзіцца, што «зусім нічога не паспяваем». Рацыянальна, з найбольшай карысцю выкарыстоўваць свой час вучаць метады тайм-менеджменту. Вось толькі некаторыя з іх.**

**1. Уявіце, што сёння ваш апошні дзень.** Славуты Стыў Джобс на адной са сваіх лекцый прапанаваў кожнаму спытаць сябе: «Што б я зрабіў, калі б гэта быў апошні дзень майго жыцця?» Задайце і вы сабе гэтае пытанне, і калі ваш адказ не супадзе з рэальнымі планамі, значыць, трэба тэрмінова нешта мяняць.

**2. Пастаўце глабальную мэту.** Яна павінна быць настолькі значнай для вас, што нават калі сонца не закрые, то вы ўсё адно будзеце бачыць краёчкі свайго жадання. Павесьце сабе над рабочым сталом малюнак з глабальнай мэтай. Гэта ўзмоцніць матывацыю.

**3. Жывіце ў «адсеку» сённяшняга дня.** Знакаміты псіхолаг Дэйл Карнегі ў адной са сваіх кніг «Як перастаць турбавацца і пачаць жыць» напісаў: «Жывіце ў адсеку сённяшняга дня». Ідучы па жыцці з цяжкім грузам мінулага і невыносным хваляваннем за будучыню, вы далёка не пойдзеце. Здзяйсняйце ўчынкі менавіта сёння. Учора няма, а заўтра можа і не наступіць.

**4. Стаўце мэты.** У вас, акрамя галоўнай, глабальнай мэты, павінен яшчэ быць цэлы спіс з мэтамі. Іх абавязкова трэба разбіць на доўгатэрміновыя і тэрміновыя. Да доўгатэрміновых можна аднесці куплю дома праз тры гады, да канца года вывучыць англійскую мову, праз тры месяцы атрымаць павышэнне. Да тэрміновых: сёння вечарам зрабіць справаздачу, заўтра вымыць вокны, у суботу схадзіць у парк. Свае мэты абавязкова трэба запісваць на паперы. Мэта, якой няма на паперы, — гэта не мэта.

**5. Усвядомленасць.** Рабіце асэнсаваным кожнае сваё дзеянне. Каб зразумець, на што вы марнуеце свой час, зрабіце наступнае практыкаванне. На працягу тыдня кантралюйце ўсе свае дзеянні. Запісвайце абсалютна ўсё: у колькі ўсталі, колькі прымалі душ, колькі плённа працавалі, колькі часу прасядзелі ў сацыяльных сетках...

**6. Планаванне.** Завядзіце сабе нататнік і выпрацуйце звычку штовечар запісваць туды канкрэтны план на заўтрашні дзень з часавымі рамкамі. Гэта значыць пункт «падрыхтаваць прэзентацыю» павінен заканчвацца адведзеным на яго часам. Таму што без часавых рамак прэзентацыю, якую рэальна зрабіць за 3 гадзіны, можна расцягнуць на цэлы дзень і так і не скончыць. Калі вы дзейнічаеце паводле дакладнага спіса запланаваных задач, вы павялічваеце сваю прадукцыйнасць на 25%.

**7. Расстаўце прыярытэты.** Усе запланаваныя справы ў сваім нататніку падзяліце на: 1) прыярытэтныя задачы; 2) важныя, але не тэрміновыя; 3) тэрміновыя, але не важныя; 4) не тэрміновыя і не важныя. Гэтую класіфікацыю прапанаваў 34-ы прэзідэнт ЗША Дуайт Эйзенхаўэр. Так што, калі вы зноў задаяце сабе пытанне: «Як усё паспяваць?», то адзін з хуткіх і рэальных спосабаў — гэта выкрасліць заданні пад нумарам 4 з вашага спісу.

**8. Засяродзьцеся на адным заданні.** Паспрабуйце ў адно імгненне ў думках апынуцца на Эйфелевай вежы і прадумаць меню на вячэру. Нічога ў вас не атрымаецца. Так і са справамі. Не атрымаецца выконваць некалькі задач адначасова. А калі вы пачынаеце рабіць нешта адно, затым пераключаючыся на нешта іншае, а потым зноў вяртаецеся да першага, то вы скарачаеце эфектыўнасць выканання задачы ў пяць разоў. Вазьміце адну важную справу з вашага спіса, выканайце яе цалкам, якасна, і толькі пасля гэтага рухайцеся далей.

**9. Пачніце з самага складанага.** Вядомы псіхолаг і бізнес-кансультант Браян Трэйсі кажа: «З'ешце жабу на сняданак!». Пад жабай ён мае на ўвазе самую складаную і непрыемную справу. Калі вы раніцай зробіце самае страшнае, то што потым вам зможа сапсаваць настрой?

**10. Знішчыце пажыральнікаў часу.** Да іх можна смела аднесці прагляд у Instagram чужых фотаздымкаў, шматгадзінныя зносіны ў ICQ ні пра што з чалавекам, якога вы нават ніколі ў жыцці не бачылі. Няўжо той час, які вы можаце выдаткаваць на назіранне да сваёй мары, так лёгка прамяняеце на прагляд фільма, назву якога заўтра і не ўспомніце. Складзіце спіс усіх пажыральнікаў і дайце сабе слова ніколі больш да іх не вяртацца.

**11. Працуйце ў пэўны час.** Кожны чалавек мае свае біярытмы. Прааналізуйце іх. Падчас найбольшай сваёй актыўнасці спрабуйце выконваць асноўную працу. Пры гэтым абавязкова рабіце перапынкі. Бо менавіта ад правільнага адпачынку ў многім залежыць плён нашай працы.

**12. Выкарыстоўвайце з розумам час у чэргах і ў транспарце.** Сучасны чалавек праводзіць там мінімум 2 гадзіны на дзень. А цяпер памнажаем гэты час на 365 дзён. Атрымліваецца, што ў вас на год ёсць 730 вольных гадзін, або адзін вольны месяц. Колькі ўсяго можна паспець зрабіць за гэты час! Запампуйце сабе аўдыякніжку, вучыце замежныя словы, у крайнім выпадку думайце пра пазітыўнае, але ніяк не тыцкайце бессэнсоўна пальцам у тэлефон.

Вось вам і адказ на пытанне «Як усё паспяваць?». Усё вельмі лёгка і даступна. Самае галоўнае — прымяняць гэтыя метады на практыцы. І вы самі не заўважыце, як ваша жыццё зменіцца ўжо праз месяц.

**Падрыхтавала Наталля МАЎЧАНАВА**

# Рыцары ў даспехах і старадаўнія танцы

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

***— З якімі вясельнымі стылямі працуеце?***

— Зараз распрацавана шмат сцэнарыяў, але асноўнымі з'яўляюцца старабеларускі стыль, позняя народная традыцыя, стыль ампір і, нарэшце, 1930-я гады з невялікім ухілам у тэматыку Другой сусветнай вайны. Часта людзі заказваюць кавалак той ці іншай стылізаванай эпохі, а другая частка ладзіцца ў стылі сучаснага свята — з жывой сучаснай музыкай, салютамі, ілюзіяністамі.

**«Ладдзя, паветраны шар ці карэта ўжо мала здзіўляюць, але ўварванне князя са світай выклікае шок у непадрыхтаваных».**



У якім кірунку цікавей працаваць мне? Ведаеце, паглыбленне ў любую эпоху мае свае непадробныя эмоцыі, але ўлюбёным, безумоўна, застаецца Сярэднявечча.

***— Што характэрна для сярэднявечнага вяселля? Якія конкурсы і гульні можна правесці?***

— Конкурсы, забавы і гульні вельмі разнастайныя — ад сілавых да праяў кемлівасці і спрыту. Большасць старых застольных традыцый — гумарыстычныя. Нашыя продкі мелі досвед і густ у застоллях! Нязменным і для многіх эпох з'яўляюцца хрысціянскія традыцыі. Усім прапануем пачынаць застолле з агульнай малітвы. Традыцыяй з'яўляецца і павага да старэйшых — ад іх просім блаславення забаў.

Вельмі цікава, калі жаніх і нявеста выбіраюць такую забаву, як прыезд Святой Інквізіцыі. І сам суд, і спальванне на вогнішчы, і дараванне грахоў адбываюцца пры захапляльнай падтрымцы ўсіх гасцей. Хаця бываюць моманты, калі артысты іграюць так добра, што некаторыя прысутныя ўспрымаюць усё як сапраўднае. Так аднойчы адбылося на вяселлі паводле заходнебеларускіх традыцый 30-х гадоў. Нахабнае ўварванне польскіх памежнікаў, спыненне музыкі і патрабаванне скласці дэкларацыю выклікала настолькі шчырае абурэнне, што хлопцы, якія выконвалі ролі памежнікаў, ледзь не былі пабітыя!

Традыцый на самай справе вельмі шмат, рэалізаваць іх у межах аднаго дня вельмі складана. Асабліва гэта датычыцца народнага вяселля, якое ў беларусаў заўжды было вялізарным музычна-тэатральным дзеяннем.

***— А што характэрна для старабеларускага вяселля?***

— На жаль, далёка не ўсе зараз здольныя ўспрымаць многія старабеларускія традыцыі. Перыядычна даводзіцца нешта старадаўняе, асабліва элементы дахрысціянскіх традыцыйных вераванняў, спрашчаць, стылізаваць альбо ўвогуле прыбіраць. З іншага боку ёсць цікавыя заказы, дзе мусіш скласці сцэнарый вяселля менавіта паводле дахрысціянскіх традыцый, якія аднаўляем літаральна па рэштках. Адпаведна павінен рыхтаваць патрэбны рэквізіт, строі, забаўляльныя нумары. Улетку 2016 года правялі цікавае вяселле паводле дахрысціянскіх традыцый на вадзе.

Да традыцый старабеларускага вяселля, напрыклад, адносіцца зачытванне «Граматы вясельнай», абсыпанне маладых зернем, звязванне ручніком рук, перанос маладой на руках праз мост, піццё вады са студні.

***— А як праходзіць выкуп нявесты ў старабеларускім стылі?***

— Выкуп нявесты ў традыцыі беларусаў, вядома ж, ёсць. І ў досыць поўным выглядзе захаваўся яшчэ і дагэтуль. Гэта стары звычай стварэння сям'і з актам куплі-продажу, калі маладую сапраўды выкуплялі ў яе бацькоў сябры маладога перад вянчаннем. Тут шмат было жартаў і імправізацыі, але асноўныя этапы заставаліся наступнымі: жанчыны выводзілі да дружыны маладога падстаўную бабулю пад маскай, а потым ужо якую-небудзь дзяўчыну-модніцу альбо нават «цыганку». Нарэшце, справа даходзіла і да самой нявесты. За яе таргаваліся доўга, але ўрэшце сват працягваў нявесце хусцінку, тая бралася за адзін канец, сват — за другі, і так яны выходзілі да «войска» маладога.



Зміцер САСНОЎСКІ: «Вяселле ў беларускім стылі — гэта супер».

***— Як успрымаюць стылізаваныя вяселлі госці?***

— Шчыра кажучы, вельмі па-рознаму. Таму заўжды прапаную дзеля павагі да гасцей «не ў тэме» мець кавалкі праграмы паводле сучасных звычаяў, спеваў, тостаў. Заўжды знаходзіцца, як я называю «дзядзька Коля з Баранавічаў», які папросіць Верку Сярдзючку. Даводзіцца ўлічваць густы ўсіх. Бывае складана, але імкнёмся. Бо сумяшчэнне стыляў, як я ўжо казаў, непазбежнае. Таму да лімузінаў на сярэднявечным вяселлі стаўлюся абсалютна нармальна. Рэдка трапляюцца людзі з катэгарычным патрабаваннем чысціні стылю. Усе ставяцца з разуменнем да некаторых сучасных элементаў.

***— Ці бывала так, што ўсе госці прыходзілі ў адпаведных стылю вяселля строях?***

— Было, што большасць. Гэта амаль заўжды сюрпрыз і здзіўленне для старэйшага пакалення, якое часта лічыць, што маладыя звар'ецелі: ладдзя, паветраны шар ці карэта ўжо мала здзіўляюць, але ўварванне князя са світай і нечаканыя тэатралізаваныя актыўныя дзеянні выклікаюць шок у непадрыхтаваных. Увогуле, стала папулярным шакаваць і здзіўляць нечаканымі нумарамі сваіх гасцей. Цяпер рыхтуем адзін юбілей, да якога сам юбіляр не будзе ведаць нічога, акрамя імёнаў запрошаных гасцей, а там будзе поўнае Сярэднявечча.

**«Усё прадумаць і арганізаваць няпроста, але гэта таго вартае, бо застанецца ў памяці сваёй незвычайнасцю».**

***— Што рабіць, калі для вяселля трэба вывучыць спецыяльныя танцы?***

— Само развучванне танцаў заўжды ператвараецца ў цікавы інтэрактыўны майстар-клас. Але гэта для гасцей. Маладыя часта просяць падрыхтавацца да гэтага загадзя. Вучым, рыхтуем.

***— Дзе звычайна ладзяцца стылізаваныя вяселлі?***

— У адпаведных эпохам сядзібах і маёнтках — Сула, Дукора, Нясвіж, Мір, Ганка, Веста, Фестывальны, Камарова, Раздолле. Зрэшты, аздобіць памяшканне паводле выбранай эпохі — абсалютна магчымае і папулярнае дзеянне.

***— Ці ёсць вяселле, якое запомнілася вам больш за ўсё?***

— Ведаеце, запамінаецца кожнае. Ніколі няма аднолькавых вяселляў. Людзі розныя, сцэнары ніколі цалкам не супадаюць, заўсёды адбываецца нешта нечаканае і ўзрушальнае. Тут можна доўга ўспамінаць пра імправізаваныя заезды на рэтра-машынах, нечаканае выкраданне маладой з замка раней, чым да яе прыехаў на кані малады, паветраны шар, які раптоўна зляцеў з маладымі... Сумна не бывае!

***— Якое ў вас самога было вяселле? Напэўна, таксама стылізаванае?***

— Сябры-артысты, увесь «Стары Ольса», рамеснікі ў Дудутках, паплечнікі па рыцарскім руху і калегі па Таварыстве рэтра-машын зрабілі для нас сапраўднае свята, якое доўжылася тры дні. Было ўсё: 30-я гады, старабеларускі дзень, сярэднявечны, падарожжы, нават на чацвёрты дзень хапіла забаў!

***— Што трэба ведаць і пра што памятаць тым, хто хоча арганізаваць стылізаванае вяселле?***

— Толькі адно — усё прадумаць і арганізаваць няпроста, але гэта таго вартае, бо застанецца ў памяці сваёй незвычайнасцю. А яшчэ павага да сваёй гісторыі для многіх ужо стала важкім аргументам. І гэта вельмі цешыць.



**Ганна БАГІНО.**
*bahino@zviazda.by.*

■ Ёсць ідэя

## Чым замяніць звыклую вясельную кнігу пажаданняў

**Кніга пажаданняў для маладых ужо стала звыклай дэталлю на вяселлях. Але і тут нявесты не перастаюць эксперыментаваць, каб здзівіць сваіх гасцей неардынарнымі рашэннямі. «Сямейная газета» падгледзела на крэатыўных вяселлях некалькі цікавых альтэрнатыўных ідэй.**

### Пазл з фота маладых



Цікавая ідэя для пажаданняў — зрабіць пазл. Калі госці збяруць яго з мноства часцінак, то ўбачаць рамантычную фатаграфію маладых. А добрыя словы і пажаданні няхай кожны папярэдне напіша на адваротным баку кавалачкаў пазла.

### Літары



Першыя літары імёнаў жаніха і нявесты (альбо першая літара агульнага прозвішча) часта выкарыстоўваюцца ў вясельных фотасесіях. Іх можна выразаць з дрэва. А чаму б не пайсці далей — прапануйце гасцям напісаць на гэтых аб'ёмных літарах свае пажаданні. А пасля вяселля павесьце іх дома на сцяну ў якасці інтэр'ернай «фішкі» і прыемнага напаміну пра дзень вашага вяселля.

### Вінілавыя пласцінкі і пішучая машынка



Рэтра-стыль для свайго вяселля выбірае мноства пар. Калі канцэпцыя вашага свята менавіта такая, то ў якасці «кнігі» для пажаданняў падыдуць вінілавыя пласцінкі. Пасля імпрэзы вы таксама зможаце развесіць іх у кватэры замест карцін. Як альтэрнатыўны варыянт, знайсці сапраўдную пішучую машынку і арганізаваць рэтра-зону для друку пажаданняў.

### Любімыя прадметы і рэчы

Пажаданні добрыя тым, што іх можна напісаць на чым хочаш. Ададайце гасцям любы прадмет, які для вас нешта сімвалізуе або проста вельмі падабаецца: чамадан, глобус, футбольны мяч... І ў будучыні будзеце адчуваць цеплыню і падтрымку блізкіх і сяброў кожны раз, калі гэты прадмет трапіцца вам на вочы ■

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел. + 375 (214) 41 72-95, тел./факс 41-80-30 |

**Лот №1**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, реализуемое одним лотом, в составе:

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Контрольно-пропускной пункт** | Здание административно-хозяйственное | 69,5 | 250/ С-34536 |
| Составные части и принадлежности: навес | | | |
| Адрес | Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Б/1, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Механизированная мойка для грузовых автомобилей** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 874,4 | 250/ С-33937 |
| Адрес | Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Б, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Здание автозаправочного пункта** | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | 14,6 | 250/ С-34537 |
| Составные части и принадлежности: покрытие бетонное, ограждение (панели железобетонные), ограждение (металл), ворота | | | |
| Адрес | Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Б/3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Склад нефтепродуктов** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 43,0 | 250/ С-34534 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, 13 резервуаров, бетонная площадка | | | |
| Адрес | Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Б/2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |

**В состав лота входит следующее оборудование:**
Маслораздаточная колонка С-231, инв. номер 05036, маслораздаточная колонка С-231, инв. номер 05037, топливораздаточная колонка Нара 27М1С, инв. номер 05038, топливораздаточная колонка Нара 27М1С, инв. номер 05039

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20%** | **122 714,20 белорусских рублей (снижена на 30%)** |
| **Шаг аукциона** | **6 135,71 белорусских рублей** |
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания здания автозаправочного пункта предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,5111 га |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон +37529-212-15-01 |

**Лот №2**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, а также запасы (сырье, материалы, инвентарь), реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54Б

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Бытовое здание** | Здание административно-хозяйственное | 55,5 кв. м | 250/ С-36285 |
| **Бытовое здание кладовщика** (в т.ч. терасса) | Здание административно-хозяйственное | 14,3 кв. м | 250/ С-36290 |
| **Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 19,9 кв. м | 250/ С-36287 |
| **Гараж №2** | | 21 кв. м | 250/ С-36291 |
| **Профилакторий для автомашин, склад** | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей | 782,3 кв. м | 250/ С-36286 |
| **Канализационная сеть** | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения | - | 250/ С-39742 |
| **Тепловая сеть** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | - | 250/ С-39970 |
| **Склад с мастерскими** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 693 кв. м | 250/ С-36289 |

**Составные части принадлежности**: две пристройки, рампа, ограждение (кирпичное, сборные железобетонные плиты), ворота

**С перечнем оборудования, прочих основных средств, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь) и временных сооружений, входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Обременения** | **Частичная аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона** www.cpo.by |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **124 234,85 белорусских рублей (снижена на 50%)** |
| **Шаг аукциона** | **6 211,74 белорусских рублей** |
| **Сведения о земельном участке** | Для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 2,0897 га. Обременения: охр. зона систем газообеспечения и др. линейных инженерных сооружений, площадь 0,0390 га; охр. зона ЛЭП, напряжением свыше 1000 В, площадь 0,2460 га |
| **Порядок ознакомления по лоту №3** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Тукиш Валентина Евгеньевна, завхоз, контактный телефон МТС +37533-346-50-90 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 3 | 01077 | А/м Skoda Octavia Tour (рег. знак 8641 ВН-2), 2009 г.в. | 9 901,50 | 495,08 |
| 4 | 01066 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (АВ 2642-2), 2008 г.в. | 15 463,00 | 773,15 |
| 5 | 01070 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (АВ 7110-2), 2008 г.в. | 16 578,80 | 828,94 |
| 6 | 01068 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (рег. знак AI 0955-2), 2008 г.в. | 16 439,50 | 821,98 |
| 7 | 01067 | Автомобиль GAZ-52 (рег. знак ВА 9631) | 529,20 | 26,46 |
| 8 | 01016 | Автомобиль GAZ-5312 (рег. знак АА 9426-2) | 646,80 | 32,34 |
| 9 | 01153 | Автомобиль ГАЗ 31105 (рег. знак 2224ВА-2), 2007 г.в. | 1 815,80 | 90,79 |
| 10 | 01021 | Автомобиль ЗИЛ – 441510 (рег. знак 8989 ВТР), 1990 г.в. | 940,80 | 47,04 |
| 11 | 01075 | Автомобиль МЗКТ-6515 10 (самосвал), рег. номер АВ 7471-2 | 14 899,90 | 745,00 |
| 12 | 03327 | Бульдозер на базе трактора ДТ-75 (рег. знак ВА 3434), 2007 г.в. | 8 736,00 | 436,80 |
| 13 | 03326 | Бульдозер на базе трактора ДТ-75 (рег. знак ВА 3457), 2006 г.в. | 8 736,00 | 436,80 |
| 14 | 03454 | Дизмолот сваебойный МСДШ, 2008 г.в. | 6 636,00 | 331,80 |
| 15 | 02500 | Захват 1ПТМ 791170г/п 10 т, 2008 г.в. | 504,00 | 25,20 |
| 16 | 02501 | Захват 2ПТМ 791170г/п 5 т, 2008 г.в. | 630,00 | 31,50 |
| 17 | 02218 | Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в. | 83 958,00 | 4 197,90 |
| 18 | 02217 | Кран башенный КБМ-401П, 2010 г.в. | 94 458,00 | 4 722,90 |
| 19 | 03534 | Установка копровая для заб. свай на базе Т-10МБ 21-21-0 ВА-2 67-46 | 62 580,00 | 3 129,00 |
| 20 | 41076 | Снегоуборочная машина HONDA | 1 344,00 | 67,20 |

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. **По лотам №№1–19** ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон: +375292121501. **По лоту №20** ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, контактный телефон +375336774509

**Предмет аукциона**

**Оборудование, расположенное по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 21 | 31799 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2 | 1 848,00 | 92,40 |
| 22 | 31800 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2, 2006 г.в. | 1 848,00 | 92,40 |
| 23 | 31801 | Агрегат сварочный АДД 4003, 2000 г.в. | 1 596,00 | 79,80 |
| 24 | 05063 | Дистилятор | 210,00 | 10,50 |
| 25 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г. | 207,55 | 10,38 |
| 26 | 04012 | Мобильная дизельная вакуумная установка для понижения уровня грунтовых вод Н 130Д, 2008 г. | 48 479,20 | 2 423,96 |
| 27 | 05158 | Молот ковочный МА 4129А, 1991 г. | 1 355,90 | 67,80 |
| 28 | 04010 | Передвижная компрессорная станция ПКСД5-25, 2005 г.в. | 2 562,00 | 128,10 |
| 29 | 04011 | Передвижная компрессорная станция ПКСД5-25, 2007 г.в. | 2 856,00 | 142,80 |
| 30 | 31798 | Сварочный аппарат JASIC ARC-140, 2007 г.в. | 33,60 | 1,68 |
| 31 | 05106 | Станок сверлильный СМ-8П,1993 г. | 224,35 | 11,22 |
| 32 | 05081 | Станок СУН-1 (механическая пила), 1992 г. | 586,25 | 29,31 |
| 33 | 05091 | Станок точильно-шлифовальный Т-400, 1992 г. | 402,15 | 20,11 |
| 34 | 05071 | Станок шлифовальный 3К-634, 1987 г.в. | 210,00 | 10,50 |
| 35 | 05040 | Стенд профилактики 240 | 3 082,80 | 154,14 |
| 36 | 05041 | Стенд профилактический «Star 12F», 1989 г. | 913,85 | 45,69 |
| 37 | 05061 | Стенд Р-770, 1991 г.в. | 1 083,60 | 54,18 |
| 38 | 05053 | Тележка Э-312, 1991 г.в. | 134,40 | 6,72 |
| 39 | 31816 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 226,80 | 11,34 |
| 40 | 41227 | Автоматический станок для резки штапика CKY-501 | 582,60 | 29,13 |
| 41 | 07320 | Бункер БН-1,0Л | 285,60 | 14,28 |
| 42 | 42020 | Выпрямитель V-160 S, 2006 г.в. | 119,00 | 5,95 |
| 43 | 42019 | Выпрямитель ВД-306 М1У3, 2006 г.в. | 213,85 | 10,69 |
| 44 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 477,75 | 23,89 |
| 45 | 41226 | Двухголовочный сварочный станок DZW-500, 2009 г. | 3 811,20 | 190,56 |
| 46 | - | Емкость для транспортировки сыпучих материалов | 1 428,00 | 71,40 |
| 47 | - | Емкость для транспортировки сыпучих материалов | 1 428,00 | 71,40 |
| 48 | 42076 | Емкость под известь V – 10, 1995 г.в. | 583,10 | 29,16 |
| 49 | 47228 | Комплект тензометрии BSS-2t с индикатором Ci 6001 | 134,40 | 6,72 |
| 50 | 70191 | Контейнер одноблочный, 1995 г.в. | 80,15 | 4,01 |
| 51 | б/н | Машина ИП-1000 | 5 880,00 | 294,00 |
| 52 | 47197 | Машина испытательная ИП-100, 1994 г.в. | 1 770,30 | 88,52 |
| 53 | 41047 | Молот пневматический МА 4129А, 1988 г.в. | 1 428,00 | 71,40 |
| 54 | 05159 | Мусоропровод строительный (19 секций с погрузочной воронкой) | 529,20 | 26,46 |
| 55 | 40221 | Парогазогенератор ПГГ-2 | 1 512,00 | 75,60 |
| 56 | 07394 | Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А | 549,36 | 27,47 |
| 57 | 07395 | Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А | 549,36 | 27,47 |
| 58 | 07396 | Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А | 549,36 | 27,47 |
| 59 | 42022 | Полуавтомат дуговой сварки ПДГ-351, 2007 г. | 655,20 | 32,76 |
| 60 | 41229 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 61 | 41230 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 62 | 41231 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 63 | 41232 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 64 | 05155 | Сварочный аппарат THMIG-200, 2007 г. | 175,35 | 8,77 |
| 65 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201,1991 г. | 323,40 | 16,17 |
| 66 | б/н | Станок вальцовочный | 7 476,00 | 373,80 |
| 67 | 44090 | Станок деревообрабатывающий | 159,60 | 7,98 |
| 68 | 44087 | Станок деревообрабатывающий «Лучеса» УОДМ-1, 1992 г. | 276,00 | 13,80 |
| 69 | 44170 | Станок деревообрабатывающий ФСШ-1А (К), 2005 г. | 852,00 | 42,60 |
| 70 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009 г. | 1 212,00 | 60,60 |
| 71 | 41225 | Станок для прессовки углов APEX,1989 г. | 1 768,80 | 88,44 |
| 72 | 44169 | Станок для резки а/ц труб | 142,80 | 7,14 |
| 73 | 44175 | Станок для холодной гибки труб ТГС-5 | 1 673,35 | 83,67 |
| 74 | 44088 | Станок заточной ВШ-027 РЭ, 1992 г. | 170,00 | 8,50 |
| 75 | 41036 | Станок заточной М-405 | 310,80 | 15,54 |
| 76 | 41037 | Станок заточной М-405, 1991 г.в. | 144,00 | 7,20 |
| 77 | 44174 | Станок ленточнопильный «ПЛП-Астра-ЕС», 2006 г. | 3 470,40 | 173,52 |
| 78 | 41044 | Станок настольно-сверлильный ВШ-029 | 2 436,00 | 121,80 |
| 79 | 41048 | Станок правильно-отрезной СМЖ 357К | 2 772,00 | 138,60 |
| 80 | 44092 | Станок рейсмусовый МП-9-1695,1998 г. | 1 636,80 | 81,84 |
| 81 | 44093 | Станок сверлильный СМ-8ПК | 302,40 | 15,12 |
| 82 | 05086 | Станок токарный 16-Б20 | 2 268,00 | 113,40 |
| 83 | 41041 | Станок токарный 1К-62 | 1 176,00 | 58,80 |
| 84 | 42069 | Станок точечной сварки МТ16/18, 1991 г. | 1 184,40 | 59,22 |
| 85 | 05070 | Станок фрезерный 6Р82 | 2 772,00 | 138,60 |
| 86 | 44095 | Станок шлифовальный 3К-1334 | 646,80 | 32,34 |
| 87 | 43079 | Сушильный шкаф СНОЛ 3.5, 1997 г.в. | 165,90 | 8,30 |
| 88 | 00464 | Трансформатор сварочный ТДМ-252 У2 | 260,40 | 13,02 |
| 89 | 40018 | Трансформатор ТСЗИ 380/36, 1993 г. | 45,50 | 2,28 |
| 90 | 41065 | Установка горизонтальная СМЖ-54А | 5 628,00 | 281,40 |
| 91 | 40220 | Установка прогрева бетона КТП ОБ 63 У1 | 840,00 | 42,00 |
| 92 | 40024 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г.в. | 481,95 | 24,10 |
| 93 | 40025 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г.в. | 481,95 | 24,10 |
| 94 | 70223 | Шкаф металлический, 2000 г.в. | 93,80 | 4,69 |
| 95 | 8911 | Блок-контейнер | 1 276,10 | 63,81 |
| 96 | 8907 | Блок-контейнер «Душевые кабины женские» | 1 434,40 | 71,72 |
| 97 | 047 | Бороздодел GNF 65 A | 663,60 | 33,18 |
| 98 | 00508 | Влагомер МГ 4-У, 2007 г.в. | 395,85 | 19,79 |
| 99 | 056 | Гидравлический домкрат | 369,60 | 18,48 |
| 100 | 057 | Гидравлический домкрат | 369,60 | 18,48 |
